
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
Францішак БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

Штотыднёвая газета (Выходзіць з сакавіка 1990 г.) ◈ 40(148) ◈ 6 кастрычніка 1993 г. ◈ Кошт — 5 рублёў.

ПОСТУП ТЫДНЯ



На праведзенай рабочай нарадзе прадстаўнікоў апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце абмяркоўваліся пытанні ў сувязі з маючай адбыцца асенняй сесіяй парламента. Сярод іх — перспектывы стварэння кааліцыйнага ўрада.

◆

ФЕДЭРАЦЫЯЙ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ САБРАНА ЎЖО БОЛЬШ ЗА ПАЎМІЛЬЁНА ПОДПІСАЎ ЗА ДАТЭРМІНОВЫЯ ВЫБАРЫ ПАРЛАМЕНТА. Хочацца верыць, што ФПБ зможа зрабіць тое, што не ўдалося зрабіць БНФ, сабраўшы больш за 400 тысяч подпісаў.

◆

ВЯРХОЎНЫ САВЕТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЗБЯРЭЦЦА ТОЛЬКІ 9 ЛІСТАПАДА. Відаць, многім дэпутатам гэта якраз і трэба, бо да таго часу павінна праясніцца сітуацыя, якая склалася ў Расіі, і будзе зразумела, ставіць пытанне аб зняцці Старшыні Вярхоўнага Савета ці не.

◆

1 кастрычніка ў Беларускім інстытуце праблем культуры пачаўся навучальны год, дзе ўпершыню ў краіне пачалася падрыхтоўка спецыялістаў-кінадраматургаў, якіх раней рыхтавалі ў Маскве.

◆

На пасяджэнні калегіі Міністэрства інфармацыі абмеркавана пытанне «Аб ходзе выканання Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» калектывамі прадпрыемстваў «Белсаюздруку» і рэспубліканскай фірмай «Белкніга». Калегія прызнала дзейнасць гэтых арганізацый па выкананні Закона аб мовах і Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларусі недастатковай.

◆

МЕНСКІ ГАРВЫКАНКАМ ДАЎ РАСПАРАДЖЭННЕ перакласці на беларускую мову ўсе шыльды ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, фірмаў і іншыя інфармацыйныя надпісы ў горадзе і ўстанавіць іх да 1 снежня гэтага года. А ў цэнтры Менска замена шыльдаў і надпісаў павінна была прайсці да 1 верасня. Але перамен амаль нябачна.

◆

У БЕЛАРУСІ ЎПЕРШЫНЮ РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫДАННЯ грунтоўная ветэрынарная энцыклапедыя на беларускай мове.

◆

ЗА ПАДРЫХТОЎКУ МЕТАДЫЧНАГА ДАПАМОЖНІКА па вывучэнні гісторыі Беларусі для сярэдніх школ узялася ў Магілёўскай вобласці ініцыятыўная група.

◆

У КІЁСКАХ «САЮЗДРУКУ» з'явілася новая газета «Панарама». Штотыднёвік адрасуецца будаўнікам, архітэктарам, праекціроўшчыкам. На жаль, беларускасці ў газеце мала.


Жыве беларуская вайсковая слава

Падзеі XVI стагоддзя займаюць асобнае месца ў гісторыі нашага народа. У той час маладое Маскоўскае царства пачало збройную экспансію на захад, імкнучыся далучыць да сябе землі дзяржавы нашых продкаў — Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Вайна вялася з пераменным поспехам, але бітва, што адбылася пад Воршай 8 верасня 1514 года, на доўгі час спыніла варожае нашэсце з усходу на Беларусь. Але нават сёння наша расколатае ідэалогіяй грамадства ўспрымае мінулае неадназначна. Для адных падзеі амаль пяцісотгадовай даўніны ёсць сімвал збройнай барацьбы беларускай дзяржавы за сваю незалежнасць, другія ж успрымаюць вяртанне гістарычнай памяці народа як акцыю варожасці да суседняй Расіі, ды рускіх наогул.

Слушнасць тых ці іншых поглядаў дазволіла вызначыць акцыя святкавання 479-х угодкаў перамогі пад Воршай, праведзеная 8 верасня ў Менску. Яе арганізатары і ўдзельнікі здолелі паказаць усім: патрыятызм беларусаў далёкі ад шавінізму, а шанаванне сваёй гісторыі не мае нічога агульнага са спробамі распаліць міжнацыянальную варожасць.

У гэты дзень на пляцы ля опернага тэатра панаваў настрой свята — свята вяртання народу ягонай годнасці, свята новай Беларусі.

У. ПАНАДА.





Усклаўшы вянкі да помніка Перамогі, удзельнікі Беларускага згуртавання вайскоўцаў прайшлі маршам ад плошчы Перамогі да опернага тэатра.
Гучаць беларускія абрадавыя песні.

Фота аўтара.

Свята ў Магілёве

Нягледзячы на супрацьдзеянне афіцыйных улад, у Магілёве быў урачыста адзначаны Дзень беларускай вайсковай славы.

8 верасня патрыятычна настроеныя магілёўцы сабраліся на адкрытай пляцоўцы перад Палацам школьнікаў для прынясця грамадзянскай прысягі на вернасць Беларусі і яе народа. Ім не здолелі перашкодзіць прысягаць супрацоўнікі міліцыі і «людзі ў цывільным». Магілёўцы таксама не дазволілі затрымаць дэпутата гарсавета, старшыню Магілёўскай філіі БНФ Анатоля Фёдарава. Акт прынясця грамадзянскай прысягі адбыўся.

Дзіўнае ўвогуле становішча склалася на Беларусі. Сапраўдныя патрыёты сваёй Радзімы лічацца на Бацькаўшчыне ворагамі, людзьмі, якія ўяўляюць небяспеку. І гэта як быццам у незалежнай (суверэннай) дзяржаве!

Пасля грамадзянскай прысягі на пляцы гучалі беларускія песні ў выкананні магілёўскіх бардаў Ігара Мухіна-Рабянка і Сержука Кулягіна.

Да Дня беларускай вайсковай славы была прымеркавана таксама прэзентацыя гісторыка-публіцыстычнага фільма «Магілёў», створанага па замове фонду адраджэння тэатра і культурнай спадчыны Магілёва творчай групай Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра (рэжысёр Уладзімір Колас, аўтар сцэнарыя Юрась Чудзін). У непрацяглым фільме (30 хвілін) аўтары здолелі паказаць слаўны і ў той жа час трагічны лёс горада над Дняпром.

Юрась ПІВУНОЎ,
дырэктар Магілёўскай філіі Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра.



✦✦✦

Генадзь Шэлег працуе ў Менскім аўтапарку № 6. Яму 29 гадоў, жанаты, мае двух дзяцей. Кваліфікацыя – шафёр першага класа. Палітыкай ці грамадскімі справамі ён, як і большасць работнікаў, цікавіцца мала. Вызначаецца адным: аб'явы прыпынкаў падчас працы на маршруце робіць па-беларуску.

Ён — адзін з тых, хто, нарадзіўшыся ў вёсцы і скончыўшы там беларускую школу, прыехаў у вялікі горад і застаўся там. Іх мільёны — людзей, якія трапілі ў чужое ім гарадское асяроддзе, але здолелі захаваць памяць аб культуры і мове свайго дзяцінства. Цяпер яны, кожны па-свойму, не чакаючы і не патрабуючы загаду, пачынаюць вяртацца да мовы бацькоўскага дому.

«Асцярожна, дзверы зачыняюцца»,— прагучала з дынаміка.— Наступны...» Які будзе наступны этап фармавання масавай свядомасці беларусаў?

У. ПАНАДА.
Фота аўтара.

✦✦✦

ВЫКОНВАЮЧЫ ЗАКОН АБ МОВАХ

Паводле загада дырэктара на Гомельскай спецыялізаванай аўтабазе па санітарнай ачыстцы горада з верасня гэтага года ўводзіцца беларускамоўнае справаводства. Пэўная падрыхтоўчая работа была праведзена загадзя: па-беларуску афармілі большасць нагляднай інфармацыі ў вытворчых і службовых памяшканнях, правялі курсы беларускай мовы, набылі слоўнікі для кожнага аддзела і службы, выпісалі газеты «Звязда», «Наша слова», «ЛіМ», а таксама двухмоўныя дэмакратычныя «Гомельскія ведамасці» і «Народную газету», па-беларуску сталі рабіць аб'явы па ўнутранай сувязі. Усё гэта садзейнічала стварэнню адпаведнага псіхалагічнага настрою ў калектыве. З ліпеня гэтага года ўсе службовыя дакументы ўжо друкуюцца па-беларуску: і для ўнутранага карыстання (загады, палажэнні, штатныя расклады і інш.), і тыя, што ідуць за мыжы прадпрыемства (плацёжныя патрабаванні, розныя даведкі). Ніхто, дарэчы, са спецыялістаў і служачых не выказаў супраць, незалежна ад узроўню валодання мовай і асабістых адносін да справаводства па-беларуску. Знайшліся на прадпрыемстве людзі, якія ведаюць мову, ахвотна карыстаюцца ёю і самахоць дапамагаюць іншым.

Некаторыя бачаць у гэтым прымус, бо загад усё-такі быў. З адным мясцовым бізнесменам здарылася нават істэрыка, калі даведаўся, што на спецаўтабазе ўводзіцца справаводства на беларускай мове.

Грошы, маўляў, выдаткоўваюцца не на каўбасу, а на мову. Але ўсім цывілізаваным народам даўно зразумела, што без мовы не будзе свабоды, а без свабоды не будзе і каўбасы.

Ці ёсць упэўненасць, што беларуская мова трывала замацуецца ў справаводстве нашага і іншых прадпрыемстваў? Такой упэўненасці, на жаль, няма. Усё будзе ў першую чаргу залежаць ад стаўлення дзяржавы да м овы і Закона аб мовах. Пакуль высокія дзяржаўныя структуры будуць ігнараваць Закон аб мовах, кіраўнікі на месцах на яго наогул не будуць зважаць. Аднак і праз тры гады пасля абвяшчэння беларускай мовы дзяржаўнай паступаюць на прадпрыемствы дакументы на «саюзнай» мове з абласнога і гарадскога выканакамаў, Дзяржэканамплапна, Мінфіна, іншых міністэрстваў і ведамстваў, акрамя, бадай, Дзяржкампрацы, дакументы якога апошняга часу надрукаваны па-беларуску.

Калі ж увядуць дзве дзяржаўныя м овы (чаго дабіваюцца найбольш непрымірымыя) хоць ва ўнітарнай дзяржаве, якой з'яўляецца Беларусь, што немагчыма нават з пазіцыі здаровага сэнсу, то чыноўнікі зразумеюць гэта так: «как хочу, так и ворочу», і ўсё вернецца да звыклага рускамоўя.

Мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка па адраджэнні беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця будзе мець шырокую падтрымку не толькі многіх тысяч людзей, шчырых прыхільнікаў роднай мовы, але і ўсяго насельніцтва, якое з большым разуменнем ставіцца да беларускага слова.

М. ХАДОРКІН,
сябра Гомельскай гарадской рады ТБМ імя Ф. Скарыны, эканаміст.

У суполках ТБМ

Ліст падзякі — лепшым

Менская гарадская рада таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны прыняла рашэнне адзначыць найбольш актыўных рупліўцаў адраджэння беларускай мовы за іх актыўны ўдзел у выкананні Закона аб мовах. Падрыхтаваны спецыяльны «Ліст падзякі».

Першымі такі дакумент атрымалі вадзіцелі тралейбуснага дэпо № 2 С. В. Астрэйка і І. А. Мішкевіч, рэктар Менскага педагагічнага універсітэта (былы пединститут г. Менска) Л. Н. Ціханаў, старшы майстар Менскага аўтазавода Б. А. Родзіч, дырэктар універмага «Беларусь» І. І. Гарбуз, галоўны энергетык Менскай камерцыйнай базы па гандлі металапрадукцыяй фірмы «Белметал» Ю. А. Шыбіцкі.

Менская гарадская рада ТБМ імя Ф. Скарыны заклікае кіраўнікоў усіх устаноў і прадпрыемстваў адчуць асабістую адказнасць за эфектыўнае выкананне Закона аб мовах, за выратаванне беларускай нацыі. Знікне беларуская мова — знікне беларуская нацыя. На жаль, зараз ідзе моцнае скрытае супраціўленне стварэнню поўнага беларускамоўнага інфармацыйнага асяроддзя. Але мы верым у паспяховае адраджэнне беларускай нацыі!

Мікола САВІЦКІ,
прафесар, старшыня Менскай гарадской арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны.

«Рома» — краязнаўчы клуб беларускіх цыган

У Віцебску пачаў працаваць краязнаўчы клуб цыган «Рома». Падобнае аб'яднанне пакуль адзінае на Беларусі. Між тым на Беларусі сёння жыве больш за 12 тысяч цыганоў, якія ў XV—XVI стагоддзях трапілі сюды праз Польшчу, Германію, Венгрыю. Гісторыя Беларусі ведала вандроўных і паўвандроўных, аселых і паўаселых цыганоў, а таксама метысаў. У мінулым на Беларусі існавалі цэлыя сталыя цыганскія паселішчы. Сярод іх асабліва вядомы вёскі Цыганы Гарадоцкага раёна, Завячэлле Лепельскага раёна, Калодзішчы каля Менска, пасёлак Паўночны ў нашай сталіцы, пасёлак Цітаўка пад Бабруйскам.

У 20-х — 30-х гадах у некаторых месцах Беларусі існавалі цыганскія калгасы і сярэднія цыганскія школы, а ў пачатку 60-х гадоў у Дзяржынску (Койданава) працаваў цыганскі ансамбль песні і танца.

Канстанцін КАРНЯЛЮК.
г. Віцебск.

Чыталі?

«РАГНЕДА» З САЛІГОРСКА

Нагадаем, што ў адным з папярэдніх нумароў «Нашага слова» быў змешчаны матэрыял пад аналагічнай назвай, прысвечаны «Голасу з Ліды» — газеце Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, якую нядаўна пачала выпускаць мясцовая арганізацыя ТБМ. Цяпер — знаёмства з «Рагнедай» — новай (пакуль штомесячнай, першы нумар свет убачыў у сёлетнім жніўні) газетай, заснавальнікам і выдаўцом якой з'яўляецца Салігорская рада нашага Таварыства.

«Рагнеда» пачынаецца паэтычным эпіграфам Л. Шпакоўскага-Случаніна: «Памятай, беларус, што і ты чалавек, які можа сабой ганарыцца!» Пад рубрыкай «Слынныя людзі Бацькаўшчыны» ў матэрыяле «Цярністыя сцежкі Рагнеды», змешчаным на першай-другой старонках, коратка распавядаецца аб Полацкім княстве — калысцы беларускай дзяржаўнасці — часоў князя Рагвалода і яго дачкі Рагнеды, славутае імя якой дало назву газеце. Гэта не выпадковасць, бо сёння для ўсіх свядомых суайчыннікаў Рагнеда—гістарычны сімвал няскоранасці і мужнасці, уласнай годнасці і самаахвярнай любові да маці-Беларусі.

У першым нумары ёсць і традыцыйнае «Слова да чытача», якое мае характар праграмнай заявы: «Выданне мае на мэце далучыць (чытачоў) да скарбаў нашай гісторыі, паказаць, якая самабытная і багатая наша культурная спадчына, раскрыць аспекты сучаснага жыцця ў нашым горадзе і раёне». Тут жа сцісла сфармулявана найгалоўнейшая, надзённая палітычная задача, без паспяховага вырашэння якой далейшае развіццё Беларусі ў якасці суверэннай і незалежнай дзяржавы не падаецца магчымым: «Нам неабходна ўсвядоміць: мы — не бязродныя Іваны, не пясчынкі ў гэтым сусвеце; мы — этнас, мы — народ, мы — нацыя!»

Адразу адзначым, што пераважная большасць матэрыялаў першага нумара «Рагнеды» цалкам адпавядае палітычнаму накірунку, выкладзенаму ў цытаванай праграмнай заяве. Так, пад рубрыкай «Актуальнае пытанне» ў артыкуле «Закон неабходна выконваць» падкрэсліваецца, што першага верасня спаўняецца трэція ўгодкі прыняцця Закона аб мовах, што якраз з гэтага моманту ўводзіцца ў дзеянне шэраг важных палажэнняў згаданага заканадаўчага акта (яны друкуюцца). Звернута таксама ўвага кіраўнікоў усіх дзяржаўных і камерцыйных структур Салігоршчыны на неабходнасць выканання Закона. У статыстычнай нататцы «Колькі нас?» чытач знойдзе звесткі аб нацыянальным складзе насельніцтва Рэспублікі Беларусь, дзе беларусы, нагадаем, складаюць амаль 80 працэнтаў усіх грамадзян, даведаецца таксама, колькі этнічных беларусаў жыве зараз у суседніх краінах, якія ўтварыліся на абсягах былога СССР. Сваімі ўражаннямі ад Першага з'езда беларусаў свету на другой і чацвёртай старонках газеты дзеліцца старшыня Салігорскай рады ТБМ Марыя Мацюкевіч (яна ж з'яўляецца і рэдактарам «Рагнеды»), якая ўдзельнічала ў рабоце гэтага сусветнага форума нашых суайчыннікаў.

Большая частка трэцяй паласы прысвечана антыбальшавіцкаму Слуцкаму паўстанню 1920 года — знамянальнай падзеі ў шматпакутнай гісторыі барацьбы за незалежнасць Бацькаўшчыны, якая доўгі час заставалася «белай плямай» недалёкай айчыннай мінуўшчыны і ўсяляк перакручвалася савецкімі фальсіфікатарамі. Гадавіна паўстання, нагадаем, летась была, урэшце, на Беларусі ўпершыню адкрыта адсвяткавана. Тут жа пад рубрыкай «Калейдаскоп» змешчана хроніка грамадска-культурнага жыцця Салігоршчыны. Паведамляецца, у прыватнасці, што ў людным і бойкім месцы райцэнтра ўжо другі месяц працуе кіёск па продажы беларускіх выданняў. Да слова, кіёск бясплатна перадаў мясцовай арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны дырэктар тутэйшага малога гандлёвага прадпрыемства «Роніс» спадар Мікола Робец. Болей бы нам такіх бізнесменаў! Чытач таксама інфармуецца, што актывісты нацыянальнага Адраджэння горада і раёна разам з рэспубліканскім кіраўніцтвам ТБМ вырашылі адкрыць у Салігорску нядзельную філію Беларускага гуманітарнага ліцэя. Падкрэслена, што дзеля гэтага ўжо ажыццёўлены канкрэтныя захады. Так што можна спадзявацца: самыя здольныя вучні салігорскіх школ з гуманітарнымі схільнасцямі неўзабаве змогуць дома атрымліваць падрыхтоўку, узровень якой будзе мала чым адрозніваецца ад адпаведнай адукацыі ў сталіцы.

На апошняй старонцы газеты — фальклорныя матэрыялы, аб'яднаныя рубрыкай «Паданні сівой даўніны», якія праліваюць святло на гістарычнае паходжанне назваў некаторых населеных пунктаў на карце Беларусі (Старобіна, вёсак Гоцк і Рожан). Друкуюцца праваслаўная пасхалія — даты Вялікадня — на бліжэйшыя гады, кулінарныя парады (стравы з грыбоў), крыху камерцыйнай рэкламы.

Падсумоўваючы, скажам, што ўвесь першы нумар салігорскай «Рагнеды» пакідае добрае ўражанне. Яскрава праглядаецца палітычны накірунак газеты — барацьба за нацыянальнае адраджэнне Бацькаўшчыны шляхам вяртання да роднай культуры і мовы, да нашых адвечных беларускіх каранёў. Да таго ж большасць матэрыялаў вылучаецца даволі высокім прафесіяналізмам, хоць яны падрыхтаваны на грамадскіх пачатках, а ў рэдакцыі пакуль няма ніводнага сталага супрацоўніка. Так што выказваем глыбокую падзяку салігорскім энтузіястам ТБМ, таварыству з абмежаванай адказнасцю БелПВТТА (прамысловае выкарыстанне тэкстыльна-трыкатажных адыходаў), якое з'яўляецца фундатарам газеты (дырэктар спадар Леанід Ясінаў), а таксама навукова-вытворчай камерцыйнай фірме «Грэйп» (з яе дапамогай зроблены прывабны камп'ютэрны набор і вёрстка). Ну, а «Рагнедзе» шчыра жадаем: добрага шляху.

Мар'ян ВІЖ.

СМЯРТЭЛЬНАЯ НЕБЯСПЕКА ДЛЯ НАЦЫІ

МАЛА ЧАРНОБЫЛЯ — ГІНЕ ЭКАНОМІКА

11 верасня адбыўся чарговы сойм БНФ «Адраджэньне». Абмяркоўвалася эканамічная сітуацыя ў нашай рэспубліцы і прагназавалася развіццё палітычных падзей у сувязі з аб'яўленым 7 верасня аб'яднаннем грашовых сістэм Беларусі і Расійскай Федэрацыі. З дакладамі выступілі народныя дэпутаты З. Пазьняк, В. Алампіеў, У. Заблоцкі. Меркаванні выказалі кандыдат юрырычных навук Людміла Русак, старшыня Свабодных прафсаюзаў Беларусі Генадзь Быкаў, прафесар Юры Хадыка ды іншыя сябры сойму.

Віктар АЛАМПІЕЎ: «Народ Беларусі пастаўлены на мяжу фізічнага выжывання».

У сваім дакладзе сп. Алампіеў прывёў шмат якія лічбы. Адна з іх сведчыць, што мяжа, якая падзяляла два станы нацыі — існаванне і выміранне — ужо пяройдзена. За першае паўгоддзе 1993 года ў Беларусі памерла людзей на 11,4 працэнта больш, чым за такі ж перыяд мінулага года.

Той, хто хопіцца за галаву, у роспачы будзе пытаца: чаму? Чаму мы асуджаны на выміранне? Няўжо Усявышні стварыў наш народ толькі для таго, каб ён праз дзве з палавінай тысячы гадоў пачаў выміраць? Каму мы замінаем у Сусвеце, што нас трэба вынішчыць? Ці ж каго-небудзь прыгнятаем, душым? Мы ж толькі працуем! Як пчолы!

У дакладзе спадар Алампіеў падаў лічбы, як працавалі людзі нашай рэспублікі сёлета, і параўнаў іх з вынікамі адпаведнага перыяду мінулага года. Нацыянальны прыбытак паменшыўся на 14 працэнтаў. Спад вытворчасці — 16,3 працэнта, але ўжо ў чэрвені ён запаволіўся і склаў 8,9 працэнта. І вось што дзіўна. Сёлета павялічылася вытворчасць тавараў народнага ўжытку на 6,1 працэнта, у тым ліку нехарчовых — на 13,7 працэнта. Як бачым, там, дзе, магчыма, удалося развязаць рукі, справы ідуць нядрэнна.

Штодня па радыё і тэлебачанні мы чуем лямант, што з-за развалу былога Саюза страчаны эканамічныя сувязі, і таму ідзе спад вытворчасці. Але чаму гэта не адбілася на рабоце гігантаў машынабудавання нашай рэспублікі, якія, як вядома, атрымоўваюць камплектуючыя дэталі ад дзесяткаў прадпрыемстваў з іншых краін? Павялічыўся выпуск трактароў (на 4, 2), грузавых аўтамабіляў (на 11,1), пральных машын (на 12,8), гадзіннікаў (на 14,7), радыёпрыёмнікаў (на 5,7), а электрычных сакоўніц (сокавыціскалак) аж на 44 працэнты. Мяркую, зразумела: перасталі рабіць цягачы для перавозкі балістычных ракет ды іншы рыштунак для мілітарных мэтаў. У параўнанні з адпаведным перыядам 1991 года грузавікоў выпушчана на 2 тысячы, а трактароў на 2,3 тысячы больш.

На рынках, каля універсамаў можна купіць усё што хочаш: і гародніну, і садавіну, і сыр, і масла, і мяса, і сала... Але чаму гэтага няма ў крамах? Паводле статыстыкі, калгасамі і саўгасамі рэалізавана жывёлы і птушак на 11 працэнтаў менш, чым летась, а малака — аж на 16 працэнтаў.

Спадар Алампіеў згадаў: Дзяржкамстат Беларусі лічыць, што на выніку працы калгаснікаў адмоўна ўплывае недахоп паліва, асабліва бензіну. Чаму ж урад не выконвае не толькі закон «Аб прыярытэтным развіцці сяла», але і сваю пастанову № 418 ад 25 мая 1993 года «Аб неадкладных мерах у сельскай гаспадарцы ў сувязі з складанымі пагоднымі ўмовамі», паводле якой меркавалася выдзяліць для сяла ў ліпені 88 тысяч тон бензіну і 152 тысячы тон дызпаліва? А пастуціла толькі 40 працэнтаў абяцанага бензіну і 55 працэнтаў дызпаліва. (За 7 месяцаў сельская гаспадарка атрымала 64 працэнты бензіну і 85 працэнтаў дызпаліва ад неабходнай колькасці).

У гэты ж час рэспубліка гандлюе прадуктамі нафтаперапрацоўкі. Краінам СНД пастаўлена 835,8 тысяч тон дызпаліва, 83 тысячы тон паліўнага мазуту, 32,3 тысяч тон дызельнага масла. Пасталі і ў Аўстрыю, Англію, Нідэрланды, Нямеччыну, ЗША, Швейцарыю, ды нямала: доля мінеральнага паліва і прадуктаў перапрацоўкі нафты ў экспарце — 13,2 працэнта.

Але чаму паменшыўся нацыянальны прыбытак? Спадар Алампіеў падаў лічбы, якія пацвярджаюць нежаданне ўрада павышаць эфектыўнасць работы прадпрыемстваў і арганізацый: 436 (9 працэнтаў ад агульнага ліку) з іх сёлета дапусцілі страты на 22 млрд. рублёў. У гэтым пераліку — прадпрыемствы гандлю і грамадскага харчавання (113), жыллёва-камунальнай гаспадаркі (126), транспарту (6). У такой сітуацыі нармальны ўрад павінен быў бы або выкарыстаць закон аб банкруцтве, або прыватызаваць іх, зняць з датацыі. У нас жа прыватызуюцца-прыхватызуюцца толькі тыя прадпрыемствы, якія добра працуюць.

Шмат недабрала Беларусь і з-за зніжэння экспарту. Сваю прадукцыю рэспубліка пасылае ў 82 краіны свету. За студзень—ліпень 1993 года, у параўнанні з такім жа леташнім перыядам, экспарт тавараў знізіўся на 13,8 працэнта, хаця больш вывезлі калійных угнаенняў (104,5), грузавікоў (123,3) і гадзіннікаў (187 працэнтаў). На свабодна канвертуемую валюту экспартавана тавараў на 189,9 млн. долараў ці 47,6 працэнта ад агульнага аб'ёму экспарту, а па бартэрных аперацыях на 169,2 млн. долараў (42,4 працэнта).

Спадар Алампіеў прааналізаваў, як рэспубліка прадае і купляе тавары. Прыкладам, прадалі 5169 трактароў на суму 29,8 млн. долараў. Сярэдняя цана — 5774,0 долара. А прадавалі коштам ад 2880 да 15429 долараў, прычым 53,7 працэнта экспартаваных трактароў рэалізавалі па цэнах ніжэй сярэдняй. Такое ж становішча і з продажам калійных угнаенняў, якія ў нас купляюць фермеры ўсіх кантынентаў сярэднім коштам 72,8 долара за тону. Але цяжка зразумець, чаму, скажам, Аўстрыі прадаём за 60 долараў, а Нямеччыне — за 96, Нарвегіі — за 85? Напрошваецца высноwa, што такая разбежка цэнаў была калісьці шчодра аплачана.

Зянон ПАЗЬНЯК: «Наша грамадства зараз можна параўнаць з чалавекам, які стаіць на табурэтцы і на якога накінулі пятлю. Засталося толькі выбіць табурэтку...»

Праз прыняцце адзінай фінансавай сістэмы, праз заключэнне эканамічнага саюза, што сродкі масавай інфармацыі падаюць выключна толькі як збавенне для Беларусі, нашу дзяржаву ўцягваюць у вельмі небяспечную палітычную гульню, якая, калі не запабегчы, скончыцца для нашага народа трагічна.

Сп. Пазьняк растлумачыў, у чым канкрэтна выявіцца страта нашае дзяржаўнасці і незалежнасці. Першае — гэта разбурэнне эканомікі. Як мы ўжо бачылі ў дакладзе сп. Алампіева, амаль кожнае дзесятае прадпрыемства нашай рэспублікі стратнае. А калі ўлічыць калгасы! У рэспубліцы не хапае грошай, каб даваць ім датацыю. Вось і мяркуюць іх кіраўнікі ды ўрад, што цяпер расійскія рублі пацякуць, як кажуць, ракой. Але Расія намнога далей пайшла па шляху рыначных адносін. Там ужо грошай не даюць нават сваім няўдалым прадпрыемствам. Грошы ў Расіі трэба ўжо зарабляць. І наіўна было б думаць, што беларусам зробяць выключэнне. Ды, зрэшты, шмат якія адміністрацыйныя адзінкі (так іх пакуль будзем называць) ужо перасталі даваць грошы ў агульнарасійскі бюджэт, які ім падаецца бяздонай бочкай. Нават «карэнныя» расійскія вобласці думаюць пра аддзяленне, не кажучы ўжо пра Татарстан, Башкартастан, Калмыкію. Там вельмі пільна аберагаюць сваё нацыянальнае багацце.

А што дзеецца ў нас? Наш урад ужо зрабіў канкрэтныя захады, каб здаць нашу эканоміку, найбольш вартасныя, можна сказаць, стратэгічныя аб'екты чужой дзяржаве: перададзены «Захадтрансгаз» — усе ніткі газаправодаў, што праходзяць праз Беларусь. І калі раней у пэўнай ступені можна было распараджацца імі і мець пэўную карысць з аплаты за транзіт ці аддачу хоць бы за панішчаную глебу ды тую зямлю, што выключана з вытворчасці, то цяпер і гэтага не будзе. А, прыкладам, Польшча падпісала з Расіяй пагадненне, што ў кошт аплаты за выкарыстанне польскай тэрыторыі для газаправода Польшча атрымае 15 млрд. кубічных метраў газу. Тое ж самае маглі мець і беларусы.

На сойме стала вядома, што ўжо фактычна аддадзены Расіі, пакуль што на 5 гадоў, у бясплатнае карыстанне Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. Увесь прыбытак пойдзе невядома каму, бо, вядома ж, што амаль 80 працэнтаў расійскай нафты ўжо не належыць расійскаму ўраду, а камерцыйным структурам. Беларусам жа застанецца панішчанае абсталяванне, забруджанае асяроддзе і, што найгорш, панішчанае здароўе працоўных там мазырцаў. Хто будзе асабліва клапаціцца пра іх? Галоўны клопат будзе пра тое, як атрымаць найбольшы зыск за 5 гадоў, бо хто-хто, а камерсанты ведаюць, паводле якога права яны атрымалі такі нечаканы і незаслужаны падарунак.

Сп. Пазьняк бачыць яшчэ адну бяду — ваенны саюз з Расіяй, дзеля чаго ствараецца ўся гэтая эканамічная заслона. Такі саюз юрыдычна замацуе знаходжанне на нашай тэрыторыі чужой арміі з усімі выцякаючымі адсюль наступствамі. Гэта адразу выкліча пераарыентацыю нашай эканомікі (відаць, зноў панізіцца выпуск грузавікоў для народнай гаспадаркі), павелічэнне падаткаў на ўтрыманне чужога войска. Ды самае страшнае — беларускіх юнакоў пашлюць ваяваць на Каўказ, у Сярэднюю Азію, дзе пачынаецца (крый, Божа!) другі Афганістан.

Эканамічныя і палітычныя інтарэсы наменклатуры атрымалі пэўную палітычна-ідэалагічную падставу. Яе можна ўмоўна назваць ліберал-камунізмам. Гэтая наменклатура імкнецца сумяшчаць адміністрацыйныя, старыя погляды на эканоміку і прыватныя інтарэсы, накіраваныя на абагачэнне коштам дзяржавы. Ліберал-камуністы све мэты ставяць вышэй інтарэсаў дзяржавы. Галоўнае — абагачэнне, а дзяржава ім непатрэбная. Дзяржава — гэта ж утварэнне дзеля абароны правоў кожнага чалавека.

«У гэтай сітуацыі,— падкрэсліў далей З. Пазьняк,— важна адзначыць, што заканамерна палітыка наменклатуры прыйшла да імперскіх ідэй. І заканамерна нашыя кампрадорска-наменклатурныя арганізацыі, ПКБ, «Кардынацыйны камітэт»...» пайшлі на кантакт з расійскімі арганізацыямі такога ж тыпу і пачалі праводзіць адзіную палітыку, вынік якой зараз мы ўжо назіраем.

Сп. Пазьняк спыніўся і на аб'ектыўных перспектывах развіцця сітуацыі ў рэспубліцы Беларусь, што ў значнай меры залежыць ад стану нашага грамадства. Але нават самы просты аналіз паказвае, што гэтая новая рублёвая зона, гэты эканамічны саюз вынікаў не дадуць. І відавочна, што нашая наменклатура і не ставіць вялікіх, перспектыўных задач. Задача пастаўлена: пратрымацца яшчэ адзін год і парабаваць, абрабаваць Беларусь да канца.

Адначасова будзе падарваная і наша прадпрымальніцкая сістэма, абмежаваныя магчымасці беларускага бізнесу. Яна будзе падарваная адпаведнай фінансавай палітыкай, якая ўжо закладваецца.

Небяспека крыецца вялікая. А стварэнне адзінай дзяржавы — Расійскай імперыі,— менавіта дзеля гэтага і вядзецца размова пра Савецкі Саюз,— вельмі прывідная перспектыва. І, хутчэй за ўсё, гэты працэс проста паскорыць распад Расійскай імперыі, які, дарэчы, мы ўжо назіраем.

Уладзімір ЗАБЛОЦКІ: «Дзве прычыны аб'ектыўна не дазволяць працаваць гэтым пагадненням...»

Адна — амаль палова бюджэту Расіі ідзе на датацыі. Другая — палітыка дзяржаўнага пратэкцыянізму Расіі ў адносінах да сваіх галін прамысловасці і прадпрыемстваў. (Толькі наіўны можа паверыць, што мачаха аддасць ласунак падчарыцы, а не сваёй дачцэ).

Сп. Заблоцкі згадаў і пра тое, што, з аднаго боку, нібы ствараецца адзіная мытная прастора, а з другога — урад Расіі рыхтуе клірынгавае пагадненне з Беларуссю. А клірынг звычайна выкарыстоўваецца для гандлёвых аперацый і пагадненняў з краінамі, якія не знаходзяцца ў эканамічным саюзе. Класічны прыклад клірынгу — той, што існаваў паміж СССР і Фінляндыяй.

Ёсць яшчэ адна праблема,— сказаў У. Заблоцкі.— Гэта розныя структуры эканомікі Расіі і Беларусі.

Цяпер нашыя прадпрыемствы атрымаюць расійскія грошы, купяць усё неабходнае і пачнуць эфектыўна працаваць? Ды нават прадпрыемствы Расіі, якія знаходзяцца пад парасонам федэральнага бюджэту Расіі, не маюць грошай, каб купіць патрэбнае! Калі Багданкевіч паспрабаваў атрымаць каля 80 мільярдаў наяўных расійскіх рублёў, яму Расійскі банк прапанаваў узяць грошы пад 2000 працэнтаў гадавых. А цяпер дадуць дарма?

Закрануў сп. Заблоцкі і праблему энерганосьбітаў. Ён сказаў, што пасля таго, як «Захадтрансгаз» быў перададзены ў карпарацыю «Газпром» Расіі, то наступнай прапановай стала... прапанова перавесці аплату за газ паводле сусветных цэнаў, прыкладна 80 долараў за 1000 кубічных метраў. Ён згадаў, што ў Менск прыязджаў мільярдэр Багасьян, які гандлюе нафтай, і прапанаваў адзін барэль нафты за 15,2 долара. А Расія прапануе за 18,7 долара. На 156 літрах нафты розніца амаль тры долары. (Як бачым, не трэба ехаць да арабскіх шэйхаў, якія, як плакала «Звязда», нібы ні зашто не прададуць нам нафту. Больш таго, арабскія краіны хочуць купляць сапрапель з беларускіх азёраў.)

Тое, што здарылася сёння, паводле меркавання дэпутата У. Заблоцкага,— гэта вынік бяздзейнасці ўрадавых структураў на працягу некалькіх гадоў. Што да перспектыў па энергетыцы, то сітуацыя ў рэспубліцы такая: «Закрануты недатыкальны запас, які не павінен кранацца ні ў якім разе, толькі падчас катастрофаў і вайны».

Але сп. Заблоцкі схільны лічыць: выйсце з крызісу Беларусь можа знайсці. Прыкладам, Летува настойліва прапануе Беларусі ўдзельнічаць у будаўніцтве нафтавага тэрміналу каля Клайпеды. Але наш урад не пайшоў на перамовы. Усё спадзяванне на Расію. А Расія афіцыйна заявіла: з 1996 года здабыча нафты будзе спадаць з тэмпам 60 млн. тон у год. Летува няжаве пабудавала свой тэрмінал па шведскаму праекту за паўгода. А вышэйзгаданы французскі бізнесмен бярэцца фінансаваць 30-кіламетровы нафтаправод ад Клайпеды да Мажэйкяя, дзе ўжо ляжыць нафтаправод да Полацка. Сп. Багасьян нават здзівіўся, чаму наш урад адмовіўся ад такой выгаднай прапановы. Беларусаў гэта ўжо не здзіўляе.

Віктар Івашкевіч акрэсліў невясёлую перспектыву. Вярхоўны Савет Расіі прыняў бюджэт з 50-працэнтным дэфіцытам, а гэта трыльёны рублёў. Для нашых прадпрыемстваў проста не будзе грошай, а таму Беларусь чакае закрыццё прадпрыемстваў — і ўжо не працяг, а галоп інфляцыі. Што можа быць горш: беспрацоўе і інфляцыя! Ён пераканаты, што гандаль незалежнасцю — гэта гандаль крывёю нашых салдат.

На сойме прынята заява «Аб эканамічным саюзе» і палітыцы ўладаў Беларусі» і Ухвала «Пра грамадзкае адзінства».

З. СІЦЬКО.

Згадкі

Юрка ВАСІЛЕЎСКІ, Алеся СЁМУХА

Пра беларускую школу не дбалі

(Школьніцтва на Гомельшчыне ў 1919—1926 гг.)

Знаходжанне Гомельшчыны ў 1919—1926 гг. у складзе РСФСР і наступнае далучэнне губерні да БССР дагэтуль для шырокіх колаў грамадства застаецца незразумелым гістарычным фактам. Часам уз'яднанне інтэрпрэтуецца як падарунак з боку Расіі, а не справядлівае вяртанне забранага. Асабліва многа падобных публікацый апошнім часам з'явілася ў гомельскай прэсе. Таму, каб кампенсаваць інфармацыйны голад у падзеях не такіх ужо даўніх часоў, прапануецца кароткі нарыс нацыянальна-культурнага жыцця Гомельшчыны ў адзначаны перыяд.

Паколькі развіццё нацыянальнай свядомасці непасрэдна залежала ад нацыянальнай школы, аўтарская ўвага перадусім засяроджана на тагачасным беларускім школьніцтве.

У ЛЮТЫМ 1919 г. ЦК РКП(б) пастанавіў вылучыць з БССР тры губерні —Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую — і далучыць іх да РСФСР. Апошнюю губерню неўзабаве рэарганізавалі. Губернскім цэнтрам зрабілі колішні павятовы Гомель.

Пасля заканчэння польска-савецкай вайны савецкая Беларусь мусіла задаволіцца шасцю паветамі былой Менскае губерні. Большая ж частка этнічных беларускіх абшараў была падзелена паміж Польшчаю і Расіяй.

Паколькі праграма адраджэння нацыянальнай культуры ва ўсходняй частцы Беларусі, якая аказалася ў межах РСФСР, часткова супадала з дзяржаўнымі інтарэсамі БССР, беларускія нацыянальныя дзеячы Гомельшчыны актыўна карысталіся пратэкцыяй БССР-аўскіх улад, у прыватнасці Наркамата асветы. Як пісаў Павел Любецкі ў зборніку «Маладая Беларусь», «з 1921 г. Наркамат асветы пачаў штурм русацяпскіх крэпасцяў Усходняе Беларусі». Урэшце ў Маскве пры Наркамаце асветы РСФСР было заснавана Беларускае Цэнтральнае Бюро (БЦБ), якое павінна было арганізаваць і сачыць за працэсам нацыянальнай адукацыі і асветы ў раёнах кампактнага пражывання беларусаў у РСФСР. Але адукацыя «инородцев» была абмежаванай. Афіцыйная катэгорыя «нацменшасць» ахоплівала ўсіх нерасійцаў. Яна абсалютна не ўлічвала этнічны характар канкрэтнай губерні. Такім чынам беларуская культурная праблематыка на этнічным беларускім Усходзе ставілася на адзін узровень з польскай, яўрэйскай і латышскай.

Вясною 1921 г. БЦБ вырашыла арганізаваць пры Гомельскім губернскім аддзеле народнай адукацыі сваю секцыю. Але атрымала адмову, хоць падобныя польская і яўрэйская секцыі ўжо даўно былі зарэгістраваны. ГубАНА сфармулявала наступныя прычыны адмовы: беларусы самі не хочуць вучыцца на роднай мове, вучыць іх няма каму, няма за што і ўвогуле невядома, ці ёсць беларускае насельніцтва ў губерні.

У падобную тузаніну з гомельскімі ўладамі ўступіла і Украінскае Цэнтральнае Бюро. І ўсё ж, нягледзячы на ўпартасць кіраўніцтва губерні, у некаторых школах з ініцыятывы настаўнікаў быў уведзены факультатыўны курс беларусазнаўства. Лекцыі па беларусазнаўстве пачалі чытаць, хоць і не рэгулярна, у Гомельскім педагагічным тэхнікуме. А настаўнікі сяла Прасна, што каля Гомеля, заснавалі беларускі навуковы гурток. Тым часам Наркамат асветы БССР адправіў на Гомельшчыну і Віцебшчыну школьныя падручнікі і літаратуру больш чым на 100 млн. рублёў.

Толькі летам 1922 г., саступіўшы патрабаванням БССР, пры губернскім аблАНА дазволілі існаваць беларускай секцыі. БЦБ вызначыла для секцыі 15 штатных пасад. Аднак была зацверджана толькі адна штатная адзінка.

Загадчыкам беларускай секцыі (БС) і адзіным яе супрацоўнікам стаў Сцяпан Грамыка. Працы ў яго было нямала. Нават шмат у чым тэндэнцыйны перапіс насельніцтва 1920 г. фіксаваў у Гомельскай губерні амаль 800 тыс. беларусаў, пераважна сялян. А спадзяванняў на падтрымку быць не магло хоць бы ўжо пасля знакамітай фразы старшыні губвыканкама Пестуна: «У маёй губерні беларусаў няма. Іх выдумалі інтэлігенты».

За спачуванне беларускаму руху быў нават звольнены з працы ў губернскім музеі і губАНА Ісак Сербаў — вядомы навуковец, аўтар многіх манаграфій, у тым ліку па этнакультурнай спецыфіцы Гомельшчыны. У Гомелі ён мусіў працаваць на чыгунцы. А перабраўшыся ў Менск, узначаліў універсітэцкую кафедру этнаграфіі.

На пачатку 20-х гадоў афіцыйны Гомель адкрыта адстойваў тэзіс, што беларусаў на Гомельшчыне няма. А ёсць толькі этнічныя расійцы і нацыянальныя меншасці: палякі, яўрэі і латышы.

Сапраўды, калі нешта і рабілася ў справе беларусізацыі на афіцыйным узроўні, дык толькі дзякуючы ініцыятывам БССР. У спрэчках паміж Менскам і Гомелем пасрэднікам выступала Масква, бо сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльных узаемаадносін выключала непасрэдны дыялог Менска з усходнімі беларускімі губернямі ў складзе РСФСР. Менск праз увесь час турбаваў кіраўніцтва гэтых губерняў сваімі самымі разнастайнымі захадамі ды ініцыятывамі.

БССР не траціла надзеі на ўзбуйненне тэрыторыі рэспублікі. Яна вынесла гэту ідэю на абмеркаванне ў вышэйшыя партыйныя інстанцыі савецкай Расіі.

У кантэксце падрыхтоўкі ўзбуйнення ўрад БССР бачыў і нацыянальна-культурную працу на Усходзе, у прыватнасці школьніцтва. Пачынаючы з другой палавіны 1922 г., ужо можна гаварыць пра пэўныя поспехі ў гэтай справе. Праўда, першыя 4 школы — 2 у Рагачоўскім павеце і 2 у Магілёўскім — арганізаваліся з ініцыятывы настаўнікаў, а не беларускай секцыі, якую губАНА пакінуў фактычна без сродкаў. Секцыя меркавала наладзіць нацыянальнае школьніцтва праз паступовую беларусізацыю расійскіх школ і перападрыхтоўку настаўнікаў.

31 траўня 1923 г. у газеце «Савецкая Беларусь» быў надрукаваны артыкул настаўніка з в. Пералеўкі М. Каршукова «Беларускі культурны рух на Гомельшчыне». Паводле аўтара, у адной толькі Стаўбунскай воласці адкрыцця беларускіх школ дамагаліся сяляне трох вёсак — Пералеўкі, Хлусаў і Гутны. Але ўлады задаволілі толькі просьбу адной вёскі.

Праца ў такіх умовах дазволіла адкрыць толькі 6 беларускіх школ у губерні, у якіх 6 настаўнікаў вучылі 291 вучня. Для параўнання: у той час у губерні была ўжо 21 польская школа, 43 яўрэйскія, апроч таго — іх нацыянальныя клубы, хаты-чытальні, пункты па ліквідацыі непісьменнасці, дзіцячыя дамы і сельсаветы, чаго ў беларусаў Гомельшчыны зусім не было.

І ўсё ж менавіта ў 1923 г. стаўленне ўлад да беларускага руху перамянілася. Справа ў тым, што ЦК Расійскай камуністычнай партыі даў згоду на ўзбуйненне тэрыторыі савецкай Беларусі за кошт беларускіх этнічных тэрыторыяў на Усходзе. Заставалася выпрацаваць працэдуру і вызначыць контуры новых усходніх межаў БССР.

Савет нацыянальных меншасцяў пры Гомельскім губАНА тэрмінова пастанавіў перавесці на беларускую мову выкладання «мінімум 10 школ па губерні». Пачалася рэгістрацыя настаўнікаў, здольных працаваць у беларускай школе. У праграму Гомельскага педтэхнікума вырашылі ўвесці прадмет «радзімазнаўства». У жніўні 1923 г. губвыканкам склікаў нараду па беларускім пытанні, дзе абмяркоўвалася і колькасць беларусаў у губерні. Загадчык губернскага архіва, вядомы навуковец Зміцер Даўгяла паведаміў сходу пра відавочную перавагу беларускага насельніцтва ў губерні і адзначыў гаспадарчую традыцыю сялянства як беларускую. Яго падтрымаў і супрацоўнік статыстычнага губернскага бюро Рыбін, які прывёў дадзеныя перапісаў насельніцтва.

Зразумела, што перспектыва далучэння да БССР выклікала ў кіраўніцтва Гомельскай губерні не зусім станоўчыя эмоцыі. Каб прадухіліць расфарміраванне сваіх тэрыторый альбо частковую страту іх, яны прапагандавалі альтэрнатыўную ідэю — стварэнне Заходняй вобласці, у якой «нацыянальнасць — паводле слоў кіраўніка губернскай планавай камісіі Гальдштэйна — не будзе мець значэння».

На пасяджэнні была прынята пастанова: на падставе перапісаў насельніцтва 1897 і 1920 гг. вывесці сярэднія дадзеныя па нацыянальным складзе губерні, а губернскім адукацыйным службам заняцца вывучэннем быту і мовы карэннага насельніцтва, магчымасцей арганізацыі беларускіх школ. Дзеля гэтага была складзена спецыяльная анкета. Яе разаслалі ва ўсе павятовыя выканкамы і аддзелы народнай адукацыі. Вынікі анкетавання супярэчылі назапашаным больш чым за сто год навуковым дадзеным. Натуральна, што яны не абапіраліся на вывучэнне сітуацыі ў паветах і, па сутнасці, адлюстроўвалі цынічную пазіцыю перыферыйных кіраўнікоў да беларускай культуры ў прыватнасці і да беларускага пытання ўвогуле.

Навазыбкаўскі выканкам паведамляў, што ўвядзенне беларускай мовы ў школах «совершенно невозможно». Такі самы адказ даў Старадубскі выканкам. Клімавіцкі павятовы АНА аднёс насельніцтва павета да нейкай міфічнай «смаленска-віцебскай велікароскай групы, якая гаворыць па-расейску з пэўнай доляй правінцыяналізмаў», і дадаў, што мясцовыя працаўнікі сістэмы адукацыі, вучні і іх бацькі да беларускай літаратурнай і гутарковай мовы ставяцца вельмі адмоўна. Да ўсяго, у павеце няма настаўнікаў, якія б ведалі беларускую мову і літаратуру.

Паводле пераканання Чэрыкаўскага АНА, «беларуская мова сталася б штучным насаджэннем». Рагачоўскі выканкам, прызнаючы насельніцтва беларускім і згадаўшы беларускую школьную працу ў вёсках Азяраны і Падсёлы, тым не менш выказаўся супраць беларускіх школ. Такую самую пазіцыю занялі выканкамы Рэчыцкага і Гомельскага паветаў, хоць і падалі звесткі, што беларускае насельніцтва ў гэтых паветах складае 85—90 працэнтаў і характарызавалі мову сялянства як беларускую гутарковую. Праўда, праз некалькі месяцаў Гомельскі павятовы АНА і выканкам ужо «выправілі» свае дадзеныя, сцвярджаючы, што «адкрыццё беларускіх школ у Гомельскім павеце не патрэбнае, бо беларусаў ёсць нязначная колькасць». А дзеці іх «чужды белорусскому наречию и всецело желают обучаться на чисто русском языке».

Такім чынам, не зважаючы на цыркуляры розных губернскіх служб спыніць русіфікацыйную лінію і пачаць нацыянальную працу, справа беларускага школьніцтва сустрэла рэзкае супраціўленне і на ўзроўні паветаў. Пакуль павятовыя і валасныя партыйна-савецкія органы Гомельшчыны супраціўляліся беларусізацыі, беларуская секцыя губАНА наладзіла сваю працу. Беларусізацыя ў мястэчках і вёсках трымалася ў асноўным на настаўніках і студэнтах. А беларуская секцыя дапамагала ім фінансава, забяспечвала літаратурай і наладжвала кантакты з рознымі навучальнымі і навуковымі ўстановамі БССР. У лістападзе 1923 г. утварыліся яшчэ два гурткі беларускіх студэнтаў. Адзін пры Навазыбкаўскім палітэхнікуме і другі пры Рагачоўскім педагагічным тэхнікуме. У Рагачове студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыка Янкі Мацвяёнка заняліся краязнаўствам, вывучалі гісторыю Беларусі і гісторыю беларускай літаратуры. Беларускі гурток з 60 вучняў існаваў у Краснапольскай школе імя Пірагова. Яго працай кіраваў настаўнік Андрэй Шашалевіч, — ён жа вядомы пісьменнік Андрэй Мрый.

Пэўную палёгку прынёс 1924 год. Вясною да БССР было далучана 6 паветаў Гомельскай губерні: Клімавіцкі, Быхаўскі, Магілёўскі, Рагачоўскі, Чавускі і Чэрыкаўскі. Затое ў астатніх недалучаных паветах і ў самім Гомелі беларускі рух перажыў чарговы ўціск з боку партыйных органаў, ад якіх у першую чаргу залежала развіццё беларускага школьніцтва і якія небеспадстаўна бачылі ў ім пагрозу наступнага драблення губерні. Тым больш, што Менск па-ранейшаму настойваў на вяртанні БССР усіх без выключэння паветаў губерні і перадусім самога Гомеля.

Катастрафічная сітуацыя з беларускім школьніцтвам у гады знаходжання Гомельшчыны ў складзе РСФСР прымусіла Цэнтрсаўнацмен склікаць у красавіку 1925 г. у Маскве спецыяльную нараду па беларускім і украінскім пытаннях.

Паводле даклада старшыні Цэнтрсаўнацмена Н. Мухітдынава, толькі 35 працэнтаў беларусаў у лепшым выпадку забяспечаны ў РСФСР дзіцячымі садкамі, хатамі-чытальнямі і пунктамі па ліквідацыі непісьменнасці. І толькі 5 працэнтаў беларускіх дзяцей мелі магчымасць наведваць беларускую школу.

1925/26 навучальны год стаўся для беларускай школы Гомельшчыны пераломным годам працы без перашкод, хоць і без прыкметнага спрыяння ўлад.

На 1 студзеня 1926 г. ў губерні існавалі 52 беларускія школы розных ступеняў, 2 хаты-чытальні і 25 лікпунктаў. Аднак школы беларусаў складалі толькі 5,1 працэнта ў агульнай колькасці па губерні.

У 1925 г. беларуская тэма ўпершыню выйшла на старонкі губернскага партыйнага і савецкага друку. Партыйны часопіс «Полесский Коммунар» змясціў матэрыял «Нацмен палітыка ў губерні», у якім гаворка ішла пра курс беларусазнаўства ў педтэхнікуме і нараканні сялян на беларусізацыю. А завяршаўся артыкул знаёмай высновай: перш чым адкрываць беларускія школы, трэба «глыбока вывучыць жаданне насельніцтва».

Працяг будзе.

Вучымся!

Над раскрытай кнігай

Ці маеце што есці?

У паэтычным зборніку Алеся Разанава «Каардынаты быцця», які складзены выключна з паэм — лікам чатырнаццаць, — усе творы, як кажуць, адзін за другі лепшы. На якой старонцы не разгорнеш гэтую выдадзеную ў 1976 годзе кніжку, — чытаеш — не адарвешся: дасканалая, высокая паэзія. Я так люблю гэтыя творы Алеся Разанава, так стараўся, каб і сябры зведалі тую радасць — не засталося ў мяне ніводнай кніжкі «Каардынатаў быцця». І вось сёлета настаўнік з-пад Косава, зямляк — «праз балота 15 кіламетраў да Алесевага Селішча» — падараваў мне гэтую кніжку. Зноў чытаю сваю любімую «Паэму жніва».

Народжаны ад хлеба, прагну хлеба.
Дзе затрымаўся сейбіт,
каб спытаць,
калі маё жніво пачацца мусіць
і што за доля вызначана мне.
Не ведаю —
гляджу і не знаходжу:
у іншых наліваюцца зярняты,
у іншых плён, у іншых — моц
і гонар,
бо неаддзельны хлеб ад чалавека,
і неаддзельнасць гэтая навек.
Мае палі найболей зараслі,
але — авохці — зараслі куколлем:
чаму куколлем і чаму мае?!.—
якая воля так наканавала
і знак які паўздзейнічаў на іх?..
Ніхто не скажа,
скажуць: адбылося,
што зробіш, адбылося, вось і ўсё...

Найперш паэма ўразіла мяне сваёй надзвычайнай вобразнасцю. Паэтычны вобраз ствараўся простымі словамі, аб'яднанымі, што праўда, у складаныя, вышуканыя спалучэнні... Але словы, паўтаруся, былі рэальныя, знаёмыя, свае, а таму празрыстыя зразумелыя. Вобраз выяўляўся, выпісваўся такі неасяжна вялікі, што немагчыма было адразу ахапіць яго, успрыняць цалкам, ва ўсёй велічы задумы і ўвасаблення. Адзін мой сябра, кнігалюб і аматар нашай літаратуры, нат скардзіўся, што не разумее Алеся Разанава. Паспрабаваў я тлумачыць яму: няма ў «Каардынатах быцця» нічога незразумелага. Пачаў з «Паэмы жніва», у якой — мне ўяўлялася — уся гісторыя, увесь лёс нашага народа і роспач паэта, які хоча «спасцігнуць сэнс нябыту і быцця і прызначэння», і роспач чалавека, якому «цяжка падымацца ад зямлі і жыць наноў, наноў араць і сеяць, любіць і спадзявацца — ўсё наноў...» Так, я хацеў, каб была ўбачана трагедыя — трагедыя народа і чалавека.

І вы, шаноўныя чытачы, мабыць, запытаецеся: а сэнс які з таго, што ўбачыш трагедыю? Старажытныя грэкі ўяўлялі, што праз суперажыванне (трагедыі) прыходзіць ачышчэнне, якое яны называлі словам катарсіс. Гэта трэба адчуць. Тлумачыць гэта значна цяжэй, чым тлумачыць празрыстую паводле сэнсу «Паэму жніва», як і тое, чаму «ў іншых плён... моц і гонар»?

«Паэма жніва» празрыстая і паводле задумы і сваёй пабудовы: усё геніяльнае — простае. Умоўна паэму можна падзяліць на чатыры часткі. Яны пазначаны самім аўтарам. Толькі ці варта? Ніхто ж не дзеліць на кавалкі арнамент — любуюцца ўсім цалкам. Ці бачылі вы беларускую народную аздобу — цацку — павука, выштукаванага з нітак і саломак? Які гэта складаны паводле сваёй архітэктонікі твор! Глядзіш — і дзівішся: такое толькі сучасным спосабам тварэння падуладнае, мо толькі той галаграфіі. Кажуць жа, што ў павуку адлюстравана схема Сусвету. Але ж павукі, якія віселі ў хатах нашых прашчураў і продкаў, былі створаныя іх творчым уяўленнем, фантазіяй і рукамі, што звыклі араць і сеяць, але і тварылі — з саломы — прыгажосць... Боскае тварэнне — рукамі чалавека. Так рыхтавалі душу...

«Паэма жніва» нагадвае мне майстэрствам народныя творы.

Упала зерне —
і не ўзышло,
а што ўзышло — куколле
заглушыла,
а што не заглушыла — выбіў град,
астатняе развеяў вецер...

Такімі радкамі пачынаецца паэма. У іх, мяркую, — і тэма, і ідэя, і нават, як мне бачыцца, своеасаблівы запеў, што, як у народнай песні, запавядае настрой і вельмі важны для паэтычнага твора рытм. Музыказнаўца, магчыма, параўнаў бы гучанне гэтых радкоў з гучаннем камертона.

О, колькі было прагных на нашу ніву! Крумкачы (няма патрэбы ўдакладняць, хто гэта)... Звяры з лясоў і нораў зграямі прыбеглі... «халадзела кроў: яна была ім і пітвом і хлебам...» Чытаю пра сотні набегаў крыжакоў, чытаю навуковае даследаванне Г. Сагановіча «Невядомая вайна», што пачалі друкаваць у «Спадчыне» — халадзее кроў. І нябожчык Міхась Ткачоў распавядаў пра знойдзеныя ў архівах паведамленні і запісы пра спаленыя нашыя нівы, пра зруйнаваныя гарады. А яшчэ былі набегі крымскіх татараў, якія рабавалі і бралі ў палон дзяцей — генафонд нацыі.

Аўтар вабіць чытача вобразамі-алегорыямі, падае голас, каб на слова адгукнулася братняя душа. І калі яна падрыхтаваная, калі ў ёй ёсць адпаведная струна — адгукнецца.

Баіцеся, што няма ў вашай душы такіх струн? Дарма. Усявышні надзяліў імі шчодра ўсіх, толькі, магчыма, занятыя іншым, вы не краніце іх. Расчыніце ж вакенцы душы — вочы — і чытайце!

Сяўба — жніво, вечны кругазварот працы. Сяўба — жніво, вечнае пытанне сэнсу жыцця: дзеля чаго сеяць і жаць, калі... не ўзышло, заглушыла, выбіў град? Так мог бы развівацца сюжэт філасофскага трактата. Алесь Разанаў стварае мастацкі твор, а таму адыходзіць ад такой праграмы, паглыбляе ўяўную — прастату. Яму недастаткова філасофскай глыбіні такога працягу сюжэту, такога кругазвароту сэнсу. Трагедыя мусіць пачацца з іншага, ад каранёў, тут — ад каранёў гісторыі. Сяўба і жніво, толькі акрэсліваюць кірунак звароту да душы. Сяўба і жніво, як і іншыя вобразы твора, — алегорыі: трэба памятаць, у якія часы і кім — аўтарам з якім ярлыком — пісалася паэма.

Звяры і крумкачы,
натоўпы і нябогі атрымалі,
што прагнулі,
займелі, што хацелі...

Інтэлект нацыі быў вынішчаны або высланы ў Сібір у 30-я гады. Кожны чацвёрты загінуў у Другую сусветную вайну. Пасля вайны зноў раскулачвалі. Ратуючыся ад «другіх саветаў», сотні тысяч каталікоў-беларусаў уцяклі ў Польшчу... «Мае палі найболей зараслі... куколлем...»

«Дзе затрымаўся сейбіт...»

Лёс сейбіта незайздросны, як і лёс самога Алеся Разанава, які за так званы нацыяналізм быў выключаны з БДУ. Але паэт знайшоў у сабе сілы верыць і спадзявацца:

А спелы вецер намаўляў: рыхтуйся,
а пойня нахілялася: рыхтуйся,
і камяні круціліся: рыхтуйся —
рыхтуйся неаслабна да жніва...

Рыхтуйся, хоць зерне не ўзышло, а тое, што ўзышло, куколле заглушыла і выбіў град... «Астатняе развеяў вецер...» Ды развеянае ветрам зерне не прападае: «Нішто не гіне рантам і бяздонна». І паэт адшукаў альтэрнатыву адчаю і безвыходнасці:

Няма што жаць — а раздзімаю
горан,
Няма што жаць — а наразаю
серп,
Няма што жаць — рыхтуюся
бяссонна
да вынікуу, да плёну,
да жніва...
. . . .
рыхтую да жніва душу...

Такі стан, такое імкненне ўяўляецца паэту вельмі важным, што вызначана нават кампазіцыйна. Філасофскае адступленне, а я так менавіта назваў бы гэтую частку паэмы, пастаўлена ў цэнтр твора.

А мне не дае спакою думка, чаму трэба рыхтавацца менавіта да жніва? Панішчаны плён, здавалася б, трэба ўсё пачынаць нанова — сеяць! І сам паэт паўтарае: «дзе затрымаўся сейбіт», «дзе падзеўся сейбіт», «пасеюць мяне лішняга ў зямлю». «Няма што жаць», «заўчасна агаліліся палі», «разабраны плён мой дзекуды...»

На апошнім варта засяродзіць увагу. Разабраны плён... Плён шматлікіх пакаленняў беларусаў, наша сапраўднае багацце — наша духоўная і матэрыяльная культура — разрабавана, прысвоена суседзямі. Больш за 4 мільёны слоў нашай мовы было сабрана ў 20-я і 30-я гады — якая нацыя можа такім пахваліцца? ...І крумкачы, нібы сатрэсеня, упалі з-пад нябёсаў — загінуў той збор падчас Другой сусветнай вайны. Ці асмеліўся б хто, каб не гэтая страта, гаварыць пра нашу мову, як мешаніну слоў расійскіх і польскіх?

Нашыя архітэктурныя помнікі разбураны, а ўсё ж колькі іх стаіць на нашай зямлі! Нашыя музеі абрабаваныя, а ўсё ж навукоўцы з Акадэміі навук штогод знаходзяць і прывозяць у Музей старажытнай беларускай культуры скарбы, якімі захапляюцца ўсе наведвальнікі.

Болей пяцідзесяці тамоў твораў вуснай народнай творчасці ўжо надрукавана — мізэрнымі тыражамі, адначасна. А колькі запісаных шэдэўраў ляжыць без руху, без карысці?! А колькі іх чакаюць яшчэ жнеяў і жняцоў?! Скарбы народныя сапраўды невычэрпныя!

«Будзь прывітаны, час жніва...»

Трэба жаць, каб з пасеянага продкамі мелі плён нашчадкі. Які гэта плён? Гонар за сваю нацыю, за сваю культуру, за сваю мову — прыналежнасць да народа, які стварыў такое багацце.

Але ж не жнём. Нават не ведаем, што на родных палетках. Больш слухаем, як ганьбяць усё наша тыя, хто з нашых гоняў рве прагна сцябліны, хто каласы сашморгвае ў жмені, хто зрывае і есць наша «зерне разам з асцюкамі».

Змрочны, адчайны настрой «Паэмы жніва»...

Адно плывуць аблокі і маўчанне,
аблокі і шматзначнае маўчанне,
разгойданае крыкам крумкачоў,
выццём звяроў, ускліямі натоўпаў
і шэптам жабракоў...

Як пра наш сённяшні дзень сказана! Ва ўсіх жа амаль беларускіх газетах, па радыё і тэлебачанні — выццё, ускліі і шэпт — ганьбяць плён пакаленняў беларусаў, адмаўляюць нам у праве карыстацца ім, радуюцца, цешацца з нашага бяспамяцтва.

«Будзь прывітаны, час жніва»!

П. ПАШКАВЕЦ.

Беларусы-філолагі

Вяшчун прадвесня

Дзесяць гадоў таму ў Менскай кнігарні пісьменніка з'явілася незвычайная кніга. Побач з важкімі тамамі Тлумачальнага слоўніка яна вылучалася ўжо сваімі памерамі. Некаторыя наведвальнікі адразу куплялі гэтую кнігу. А тыя, хто ніколі не чуў яе назву і пра аўтара нічога не ведаў, дзівіліся і разглядалі фаліянт, на якім золатам было выціснута «І. І. Насовіч. Слоўнік беларускай мовы».

Перагарнуўшы два лісты прадмовы на беларускай мове, можна было ўбачыць, што ўпершыню кніжка была надрукавана ў Санкт-Пецярбургу ў 1870 годзе, а таксама прачытаць: «Беларускі дыялект, які валадарыць на абшары ад Нёмана і Наровы да вярхоўяў Волгі і ад Заходняй Дзвіны да Прыпяці ды Іпуці, якім гаворыць жыхары паўночна-заходніх і некаторых сумежных з імі губерняў, ці тых мясцовасцей, каторыя некалі насяляла крывіцкае племя, ужо даўно звяртала на сябе ўвагу айчынных філолагаў ацалелымі ў ім каштоўнымі рэштамі старадаўняй мовы».

«...З-за ўсвядомленай неабходнасці мець пад рукамі слоўнік гэтага дыялекта, між іншым, і для разумення важных і цікаўных актаў, на ім напісаных, каторыя ў той час пачала выдаваць Археаграфічная камісія», аддзяленне Расійскай мовы і літаратуры Імператарскай Акадэміі навук прапанавала І. І. Насовічу прадоўжыць працу Івана Іванавіча Грыгаровіча, які толькі пачаў складаць слоўнік, але смерць перарвала гэтую справу.

Хто ж быў Насовіч? Ён нарадзіўся 6 верасня 1788 года ў вёсцы Гразівец Чавускага раёна і пасля заканчэння Магілёўскай духоўнай семінарыі больш за 30 гадоў выкладаў расійскую і лацінскую мовы ў вучылішчах і гімназіях Оршы, Мсціслава, Дынабурга (Даўгаўпілса), Маладзечна, Свянцянаў. Пасля ён пасяліўся ў Мсціславе, заняўся навуковай працаю. На аснове 5-томнага збору Актаў і грамат склаў «Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў», у якім тлумачыласа значэнне 13 тысяч слоў. Гэтая навуковая праца І. І. Насовіча была адзначана поўнай Уваравскай прэміяй у 1500 рублёў серабром, але да гэтага часу не надрукавана і захоўваецца ў Санкт-Пецярбургу.

16 гадоў складаў І. І. Насовіч «Слоўнік беларускай мовы» — арыгінальны і непаўторны збор: больш за 30 тысяч слоў. Упершыню ім былі распрацаваны прынцыпы ўкладання такога слоўніка, перавага аддавалася жываму народнаму слову, якое ілюстравалася прыказкамі, выслоўямі, фразеалагізмамі і радкамі з песень. Такім чынам, мы ведаем стан нашай мовы ў 1850 — 60-х гадах і можам выкарыстоўваць гэтыя адметныя словы для абнаўлення нашай зрусіфікаванай лексікі. А трэба ведаць, што вучоны свядома не ўключыў у слоўнік словы, якія з'яўляюцца агульнымі для расійскай і беларускай моў.

Цікава, прыкладам, напаткаць у Насовічавым «Слоўніку беларускай мовы» слова «комнут», якое ён перакладае як агульны лік (общий счёт); збор асобаў ці рачаў. І не такім ужо незвычайным падаецца тады вядомае ў сярэдневяковай Беларусі слова «кампутар», якім называлі прыладу для лічэння. Цяпер папракаюць некаторых маладых беларусаў, што яны неапраўдана ўжываюць мяккае л, што, маўляў, гэтак ніколі не гаварылі. Але ўжо І. І. Насовіч пачуў песню, у якой былі радкі: «Барысъ мудрый тэлялёгъ, упившись пад лаўку лёгъ», а таксама яшчэ дзве фразы, што пацвярджаюць шырокае бытаванне слова «тэалёг».

Іван Іванавіч Насовіч не мог не цікавіцца жыццём і побытам свайго народа, стваральніка такой багатай мовы. Духоўны свет беларусаў, іх мараль, практычная мудрасць, звычаі і павер'і, іх вусная паэтычная творчасць асэнсавана вучоным у навуковых працах: «Беларускія прыказкі і прымаўкі» (1852); «Зборнік беларускіх прыказак (1867)», у які ўключана 3500 прыказак, прымавак, скорагаворак, праклёнаў; «Беларускія прыказкі і загадкі» (1868); «Беларускія песні» (1873).

А цяпер уявіце сабе час, калі І. І. Насовіч пачаў збіраць беларускую лексіку. Забаронена ўжыванне нашай мовы і кнігадрукаванне на ёй, забаронена сама назва Беларусь. Ці адна толькі цікаўнасць вучонага кіравала ім? Ці пагодзіцеся вы, шаноўныя чытачы, што Іван Іванавіч Насовіч быў вешчуном нашага прадвесня?

Даўно (25.07.1877 г.) перастала біцца сэрца гэтага беларускага пачынальніка. Але жыве і дапамагае выжыць нашай мове яго слоўнік. Для гэтага хапае нават тысячы экземпляраў факсімільнага выдання.

З. СІЦЬКО.

З. Ю. КАПЫСКІ, П. А. ЛОЙКА, В. І. МЯЛЕШКА

БЕЛАРУСЫ: ВЁСКА І ГОРАД У ЧАСЫ ВАЕННАГА ЛІХАЛЕЦЦЯ І АНАРХІІ Ў ДЗЯРЖАВЕ

(другая палавіна XVII—XVIII стст.)

Працяг. Пачатак у № 39.

Працягваем друкаваць раздзелы з вучэбнага дапаможніка для вайскоўцаў «Гісторыя Беларусі».

Васіль Вашчыла і яго бліжэйшыя паплечнікі — Іван Карпач, Стэсь Бочка, Васіль Вецер — намерваліся другі раз атакаваць Крычаў, захапіць яго, блакіраваць замак і прымусіць княжацкае войска здацца. Пачаць наступленне планавалася 26 студзеня 1744 г. Але пра гэта дазнаўся вораг. Атрымаўшы доўгачаканае падмацаванне — гарматы і жывую сілу, кіраўніцтва радзівілаўскага войска вырашыла апярэдзіць паўстанцаў. У ноч на 26 студзеня — на той дзень, калі сяляне планавалі захапіць Крычаў, радзівілаўскія злучэнні рушылі на Царковішча. Асцярожна, пад покрывам цемнаты, княжацкі атрад наблізіўся да лагера паўстанцаў. Калі пачало днець, радзівілаўскае войска знянацку напала на сялян, якія не здолелі арганізаваць абарону. Невялікія групы паўстанцаў адыходзілі да лесу, каля 200 чалавек загінула на полі бою, 176 трапіла ў палон. Камандуючы радзівілаўскім войскам загадаў 30 паўстанцаў павесіць, яшчэ 30 пасадзіць жывымі на палі і падвесіць за рэбры на круках. Уся маёмасць актыўных удзельнікаў паўстання канфіскавалася. Па сутнасці вёскі Крычаўскага староства былі аддадзены салдатам на рабаванне. У першай палавіне лютага 1744 г. у Крычаў прыбыў гаспадар уладання Геранім Фларыян Радзівіл. Тады ж адбыўся суд над кіраўнікамі сялянскага руху. 16 паўстанцаў былі асуджаны да пакарання смерцю, аднак сярод іх імя Вашчылы не значылася.

Пасля паражэння пад Царковішчам, калі Вашчыла зразумеў, што не зможа больш сабраць сялянскія атрады, каб супрацьстаяць радзівілаўскім наймітам, ён вырашыў уцячы ў Расію. Яму ўдалося вырвацца з Крычаўскага староства і дабрацца да Латакоўскага фарпоста на тэрыторыі Расійскай імперыі. Услед доўга гналіся дзве харугвы жаўнераў. Яны даскакалі аж да фарпоста, але схапіць Вашчылу не змаглі. На той час кіраўніка паўстання пераслалі з Латакоўскага фарпоста на Цімошынскую пагранічную заставу, а потым і далей — у Старадуб, у Кіеў. Радзівіл накіраваў ліст у Кіеўскую губернскую канцылярыю з патрабаваннем выдаць яму важака прыгонных «бунтаўшчыкоў». Але адразу гэта было нельга зрабіць. Спачатку патрабавалася вызначыць паходжанне Васіля Вашчылы. Калі б кіраўніка паўстання палічылі падданым Расійскай дзяржавы — маларасіянінам, яго б не выдалі Рэчы Паспалітай згодна з Вечным мірам 1686 г. Калі б аказалася, што ён беларус, ураджэнец Крычаўшчыны, падданы Рэчы Паспалітай, то рускія ўлады мусілі б выдаць Вашчылу як уцекача. Паходжанне Васіля Вашчылы чыноўнікі расследавалі старанна і доўга. Допыты Вашчылы, яго родных, папяровая цяганіна паміж Старадубам, Кіевам, Пецярбургам працягвалася з лютага аж да верасня 1744 г. Пакуль перасылаліся лісты, указы, загады, Васіль Вашчыла, якога трымалі пад аховай у Старадубскай крэпасці, цяжка захварэў, а 28 жніўня 1744 г. Вашчыла памёр.

Буйное ўзброенае выступленне сялян у 50-я гг. XVIII ст. адбылося на паўднёвым усходзе Беларусі ва ўладанні віленскага капітула (калегіі пры каталіцкім епіскапе) Каменьшчына (Мазырскі павет). Хваляванні тут пачаліся яшчэ ў 1736 г. і з перапынкамі працягваліся больш за два дзесяцігоддзі. Прычынай іх быў непасільны прыгнёт сялян ад адміністрацыі капітула.

У 1754 г. сялянскія хваляванні перараслі ва ўзброенае выступленне. Значную ролю ў гэтым адыграў гайдамацкі рух. У 1754 г. паўстанне гайдамакаў адбылося на Жытоміршчыне, якая непасрэдна прымыкала да Каменьшчыны. Трэба думаць, што невыпадкова ў гэты ж час супраць сваіх прыгнятальнікаў са зброяй у руках выступілі сяляне Камянецкай воласці.

Самыя раннія звесткі аб камянецкім выступленні адносяцца да 7 верасня 1754 г. Пад гэтай датай значыцца загад гетмана аб накіраванні ва ўладанне дзвюх харугваў пад камандаваннем ротмістраў Бараноўскага і Швыкоўскага для падаўлення сялянскага выступлення. Напэўна, гэта ім хутка ўдалося, бо ў снежні харугвы былі адкліканы на папярэднія месца дыслакацыі.

Аднак барацьба ва ўладанні не спынілася. У кастрычніку 1755 г. сяляне зноў узяліся за зброю і тым жа дзвюм харугвам, як і год назад, давялося выпраўляцца ва ўладанне капітула. На гэты раз такой сілы для ўціхамірвання падданых не хапіла, бо Радзівіл праз месяц накіроўвае на Каменьшчыну яшчэ 4 харугвы (70 коннікаў) на чале са шляхціцам Панятоўскім. Аднак і такой колькасці для падаўлення выступлення было яўна недастаткова. У сваім лісце Радзівілу ад 8 студзеня 1756 г. Панятоўскі паведамляў, што паўстала ўся Камянецкая воласць, у якой налічвалася звыш 700 сялянскіх двароў.

Пры падыходзе харугваў да ўладання сяляне кідалі свае вёскі і хаты і накіроўваліся да мястэчка Славечна, дзе мелі намер, згуртаваўшыся, аказаць узброенае супраціўленне войску. Так і адбылося. Сялянскі атрад сустрэў людзей Панятоўскага яшчэ перад Славечнам. Нечакана для шляхецкага атрада прыгонныя пасля абстрэлу перайшлі ў атаку. Невялікае злучэнне Панятоўскага не здолела вытрымаць націску і пачало адступаць. Спачатку адступленне мела арганізаваны характар. Адыходзячы, харугвы аказвалі некаторае супраціўленне, але затым кінуліся наўцёкі. Панятоўскаму давялося адысці да Убарці — мястэчка, якое размяшчалася на адлегласці 10 міляў ад Каменьшчыны. Тут ён вырашыў затрымацца да таго часу, пакуль не надыдзе дапамога ад Радзівіла.

Рыхтаваліся да сустрэчы радзівілаўскага войска і паўстанцы. Ля в. Славечна яны стварылі ўмацаваны лагер. Па дадзеных Панятоўскага «бунтаўнікоў» налічвалася некалькі тысяч. Усёй воласцю яны далі клятву «змагацца да апошняга, хоць і галовы прыйшлося б пакласці».

У лютым 1756 г. да Панятоўскага прыбыло 55 коннікаў, а ў сакавіку з Нясвіжа падышла пяхота з гарматамі пад камандаваннем капітана Ціля. Да таго ж да Оўруча па загаду Радзівіла была накіравана гетманская міліцыя на чале з палкоўнікам Матавідлам.

Панятоўскі выступіў з Убарці, каб злучыцца пад Оўручам з міліцыяй, а потым атакаваць лагер паўстанцаў. Пасля аб'яднання пад камандаваннем Панятоўскага налічвалася ўжо каля 400 чалавек. Гэта былі і гусары, і лёгкая конніца, і пяхота з артылерыяй. З гэтай сілай ён мог разлічваць на поспех у сутычцы з сялянскім атрадам, таму адразу накіраваўся да Славечна.

Атабарыўшыся пад лагерам, Панятоўскі накіраваў сурмача да паўстанцаў з прапановай капітуляцыі. Але тыя адзінадушна пацвердзілі сваё рашэнне змагацца да апошняга. Пасля такога адказу камандуючы шляхецкім атрадам аддаў загад атакаваць замак. Вайскоўцы падпалілі гумны, у якіх паўстанцы зрабілі засады. Атака была імгненнай, і сяляне не вытрымалі націску. Замак быў захоплены. Паўстанцы згубілі 60 чалавек. Больш таго, некалькі дзесяткаў сялян патанулі ў балотах, якія суседнічалі з лагерам. Каля 60 чалавек раненых былі ўзяты ў палон. Аднаго з палонных карнікі адразу пасадзілі на палю.

Гэта быў пачатак жорсткай расправы, якую ўчынілі пераможцы над паўстанцамі. Потым на месца экзекуцыі яны сагналі ўсё дарослае насельніцтва Камянецкай воласці і пачалі выконваць прысуды: адных удзельнікаў сялянскага руху каралі смерцю, іншых — білі бізунамі. Перад адыходам з мястэчка Панятоўскі загадаў 4 кіраўнікоў паўстання пасадзіць на палі, а 10 сялянскіх важакоў, прывязаўшы да гармат, адправіць у Нясвіж на суд да Радзівіла. На жаль, прозвішчы паўстанцаў, іх далейшыя лёсы невядомы.

Такім чынам, паўстанне на Каменьшчыне, якое мела лакальны характар, пацярпела паражэнне. У ім, як і ў паўстанні сялян Крычаўскага староства, а таксама іншых узброеных выступленнях прыгонных, дакладна праявіліся тыповыя для феадальнай эпохі раз'яднанасць сялянскага руху, яго непаслядоўнасць, якая вынікала з рознасці інтарэсаў асобных катэгорый сялянства.

Але, разам з тым, безвыніковымі сялянскія выступленні назваць нельга. Бо пасля іх становішча сялян на некаторы час паляпшалася, ліквідаваліся найбольш агідныя праявы феадальнага прыгнёту.

У другую палавіну XVII—XVIII ст. беларускія гарады ўвайшлі ў стане страшэннага разбурэння, што прынесла дваццацігадовая «смута» 1648—1667 гг. Так, калі 18 гарадоў і мястэчак Навагрудскага ваяводства да пачатку войн 1648—1667 гг. налічвалі 4071 дом, то пасля гэтага часу — 2329 дамоў, г. зн. было знішчана 1742 дамы, ці 42,8 працэнта, 8 гарадоў Берасцейскага ваяводства налічвалі адпаведна 4745 і 2012, г. зн. знішчана 57,6 працэнта дамоў, 12 гарадоў Менскага ваяводства — 1646 і 809, г. зн. 50,8 працэнта даваеннай колькасці дамоў. Ад 50 да 70 працэнтаў дамоў страцілі за гады войнаў Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае ваяводствы.

Са спыненнем ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў гарадах пачалося паступовае аднаўленне гаспадарчага жыцця. Гэты працэс працягваўся да другой палавіны XVIII ст. шляхам вяртання гарадам звыклых ім функцый цэнтраў рамёстваў, унутранага і знешняга гандлю. З аднаўленнем рамяства вярталася і яго папярэдняя арганізацыя — цэхі. Разам з тым узмацнялася значэнне некаторых з'яў, што ўзніклі ў першай палавіне XVII ст.: узрастанне ролі скупшчыка-пасрэдніка ўжо не толькі з купецкага асяроддзя, але і з ліку багатых майстроў, цэхмістраў. Абвастраюцца адносіны паміж цэхамі і «партачамі» — нецэхавымі рамеснікамі, паміж блізкімі па прафесіі цэхамі.

Да новых рысаў эканамічнага жыцця можна аднесці ўзнікненне мануфактурнай вытворчасці. Узмацненне манаполіі цэхаў на рынках гарадоў абумовіла канцэнтрацыю мануфактур галоўным чынам у мястэчках, малых гарадах, якія складалі частку магнацкіх уладанняў. Так, у 30-я гг. XVIII ст. у мястэчку Урэчча Бабруйскага павета ўзнікла мануфактура шкляных вырабаў, у мястэчку Свержань — фарфоравая мануфактура, у 1751, 1753 гг. у Слуцку заснаваны мануфактуры, дзе выраблялiся адмысловыя шаўковыя паясы і суконныя тканіны. У другой палавіне XVIII ст. мануфактурная вытворчасць пачала набываць рысы маштабнасці. У ліку найбольш вядомых у гэты час былі мануфактуры ў малых гарадах і мястэчках Крычаве, Шклове, Горках, Добрушы, Дуброўне, Мышы і інш. Усяго ж на 53 мануфактурах у азначаны перыяд было занята 2400 рабочых, большая частка якіх складалася з прыгонных.

Значны зрух адбыўся ў знешнім гандлі, якім займалася гарадское купецтва. Справа ў тым, што ўзрасла роля Пецярбурга, праз які купецтва паўночна-заходніх гарадоў Расіі разгарнула свае экспартныя аперацыі ў Заходняй Еўропе. А гэта рэзка скараціла значэнне пасрэдніцкай дзейнасці беларускага купецтва, пераарыентаваўшы яго гандлёвыя сувязі на гарады паўночна-заходняй Расіі і Левабярэжнай Украіны. Але структура гандлёвых аперацый істотна не змянілася. Па-ранейшаму яе асновай была прадукцыя сялянскай гаспадаркі, а ўвоз складаўся з вырабаў прамысловасці, металаў, галантарэі.

Вярхоўная ўлада, улічваючы значэнне гарадоў у процідзеянні магнацкаму самавольству і феадальнай анархіі, садзейнічала гараджанам у аднаўленні ролі самакіравання. Так, за мяшчанамі Магілёва ў 1661 г. і пазней за мяшчанамі Гародні было замацавана права выбіраць войта горада. На працягу 60-х гг. XVII ст. члены магістратаў Магілёва, Віцебска, Гародні атрымалі шляхецкія правы. У 1764 г. сойм прыняў рашэнне аб ліквідацыі ў гарадах судовай юрысдыкцыі шляхты і духавенства, і гараджане, якія жылі на юрыдыках феадалаў, падпадалі пад уладу магістратаў. У 1776 г. сойм пастанавіў адмяніць магдэбургскае права ў гарадах, якія не з'яўляліся цэнтрамі ваяводстваў і паветаў. Тут спецыяльнай камісіяй устанаўліваўся асобны парадак, які павінен быў гарантаваць мяшчанам іх уласнасць, свабоду займацца рамяством, гандлем, права куплі-продажу дамоў і іншай маёмасці, свабоду змены месца пражывання.

(Матэрыял скарочаны; тэкст да друку падрыхтаваў М. Віж.)



Рубрыку вядзе

ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ

Калі б Акакій Цэрэтэлі (1840—1915), слынны паэт Грузіі, напісаў у жыцці толькі адзін свой верш, «Суліко», ён усё адно не быў бы ніколі забыты.

Акакій ЦЭРЭТЭЛІ

Суліко

**Я магілу любай шукаў,
Толькі не знаходзіў навакол.
Доўга плакаў, суміўся, гукаў:
«Дзе ж ты, дарагая Суліко?»**

**Я прыкмеціў ружу між шыпоў —
Век не бачыў вабнасці такой.
Да яе ў трымценні падышоў:
«Ці не ты мая Суліко?»**

**Кветка невыказнае красы
Нахіліла ў згодзе галаву,
І, як слёзы, пацеркі расы
Пырснулі ў зялёную траву.**

**Салаўя убачыў праз лісты
І патурбаваў яго спакой,
Я спытаўся ў птушкі: «Ці не ты,
Ці не ты мая Суліко?»**

**І ў адказ пачуў ласкавы спеў
Ціхага дагэтуль салаўя,
Быццам бы сказаць ён мне хацеў:
«Хіба ты не бачыш — гэта ж я!»**

**Зорка ззяла светла нада мной,
Нібы намякала спатайком.
Я спытаў, любуючыся ёй:
«Ці не ты мая Суліко?»**

**І яна мігнула мне ў адказ,
Промнямі пагладзіла мяне.
І якраз у гэты самы час
Ветрык мне на вуха зазвінеў:**

**«Тое, што шукаў, ты ўжо знайшоў —
Удыхні, паслухай і зірні.
Ты знайшоў яе — і боль прайшоў,
Хай цяпер твае святлеюць дні.**

**Стала ружай, зоркай, салаўём
Тая, што пяшчотна ты кахаў,
Не, каханне шчырае тваё
Не здалела чорная туга».**

**Зразумеў я гэты запавет,
І не праклінаю я свой лёс.
І ўжо больш не скарджуся на свет,
І не праліваю болей слёз.**

**Ружаю журбу сваю лячу,
Слухаю, шчаслівы, салаўя,
Радасны, за зоркаю сачу,—
І нібыта зноў з табою я.**

**Зноў мне стала хораша ў жыцці —
Я знайшоў цябе праз боль вякоў:
Гэта ты спяваеш і мігціш,
І цвіцеш, як ружа, Суліко!**

Пераклад Янкі СІПАКОВА.

Пошук праўды

«Пакіньце займацца дурніцай»

Некаторыя газеты ды часопісы ператварылі 1993 год у «год Мядзёлкі». Публікацыя яе ўспамінаў, навукова-апалагетычныя прадмовы, нарысы, падобныя на доўгія вучнёўскія шпаргалкі, дробненькакаліберныя бліц-эсэ. І гэта — паралельна з публікацыяй у «ЛіМе» рэплікі Таццяны Процькі, дзе Мядзёлка даволі доказна раскрываецца ў апостасі... як агент ГПУ. А назвы юбілейных публікацый аж заходзяцца: «Паўліна, Паўлінка, журавінка». Пераказваюць, цытуюць як вялікую асветніцу-прарочыцу: «Бо ўсё прыгожае, вольнае, светлае, усё новае родзіцца праз мукі, цярпенне, праз кроў» («ЛіМ», 10.09).

Што тут сказаць, калі нас так выхоўвалі: што кроў, што журавінны сок — абы чырвонае. Не ведаем, дзе напісаў Купала неўміручую «Паўлінку», дзе яна была пастаўленая ўпершыню, якая з выканаўцаў была першая («Звязда», 11.09), але падайце нам Віёна ды Платона, каб праз іхнія аўтарытэты параўнаць Мядзёлку ды з Ларысай Геніюш, назваўшы іх «дзвюма паловамі пярсцёнка» (?!). Людцы, гэта ж ці не тое самае, што параўнаць сініцу ды начніцу альбо жураўля ды вераб'я. Апломб, памножаны на недасведчанасць?..

Чытаючы прадмову прафесара Уладзіміра Калесніка да палымянскай публікацыі Мядзёлчыных «запісак», я заўважыў, як ён тую самую «крывавую» Мядзёлчыну цытату элегантна абмінуў, паставіўшы нейтральнае шматкроп'е (№ 2, с. 175, радок 32 зверху). Гэта вам не Марціновіч з «ЛіМа» альбо Вераціла са «Звязды». Аднак не ўсё ўдалося зразумець мне і ў прафесара. Прынамсі, там, дзе ён асноўную надзею на разгадку гібелі Купалы так упэўнена ўскладае на расследаванне з подпісамі членаў пахавальнае камісіі. Даруйце, але мне здавалася, што пахавальныя камісіі наладжваюць парадак пахавання, паніхіду, а расследаванні робяць адпаведныя інстанцыі ды спецыяльныя камісіі, прызначаныя імі. Паралельна, вядома, могуць падключыцца «самадзейныя Шэрлакі Холмсы» альбо «патрыёты-экстрасэнсы», на якіх шаноўны наш прафесар пазірае неяк «зверху». Альбо гэта элемент самаіроніі?

Чытайце ўважліва: «Мне давялося натрапіць на звесткі, што апошні раз Паўліна Мядзёлка магла сустрэцца з мужам (мо з былым ужо? — Г. К.) восенню 1921 года на нацыянальнай канферэнцыі ў Празе».

Звесткі, што магла сустрэцца, а магла і не сустрэцца? Варыянтнасць, верагоднасць — наша ахілесава пята. Калеснік піша: «Пасля гэтага (пасля таго, як Грыб з Мядзёлкаю «маглі» сустрэцца? — Г. К.) Тамаш Грыб спрабаваў адведаць яе ў Дзвінску ў 1922—1925 гадах і ў Менску — у 19826 годзе, але латвійскія ўлады не пажадалі яго прыняць, а ў БССР пабаяліся пускаць кіраўнікі Беларускай Рады ў Чэхаславакіі як чалавека канфліктнага і неўгамоннага».

Мо пахвалюся — мне таксама сёе-тое «давялося». Атрымаўшы доступ да сакрэтаў колішняга партархіва беларускага ЦК, натрапіў на цікавы дакумент, які прафесару Калесніку, відаць, быў невядомы (НАРБ, Ф. 4, в. 21, с. 69, л. 243). Калі ён недзе друкаваўся, хай даруюць мне дасведчаныя людзі.

Перлюстрацыя (тайны прагляд і, ведама ж, перапісванне карэспандэнцыі з мэтай сачэння, цэнзуры. — Г. К.). Адна старонка шчыльнага машынапісу. Грыб — Мядзёлцы, з Прагі ў Менск. Мяркуйце самі, хоча ён ці не сустрэцца з ёю ў Менску, хоча ён ці не прыехаць з капіталістычнай Прагі ў сацыялістычны Менск, і хто яго пускае альбо не пускае да яе.

«Палуша!

Даўно я табе не пісаў і гэта зразумела — быў заняты падгатоўчай працай да дахтароту. Цяпер маю крыху вольнага часу. Пішу. Дык вось. Я атрымаў тваю тэлеграму і твоё пісьмо, на тэлеграму даў такі адказ: — пакіньце займацца дурніцай. Застаюся работнікам. Пішу адказ на пісьмо.

Каб не было ніякіх непаразуменняў высьвятляю табе ўсё па парадку. Ты пішаш каб я зараз жа прыязжаў у Менск. Мой адказ на гэта ёсць: Пры сучасных абставінах у Менск я прыехаць не магу. Чаму? А таму што я як і раней, як і заўсёды цьвёрда стаю на прынцыпова ідэалегічным грунце. Я не пакідаю быць цьвёрдым у сваіх перакананьнях, я не мяняю сваіх перакананьняў, свайго сьветапогляду ў залежнасці ад часова-зьменных войнкавых абставінах (захоўваю магчымыя машынапісныя памылкі перлюстрацыі. — Г. К.), як гэта робяць іншыя Ягомосьці, што сягодня едуць заграніцу ў Менск, шукаючы там сабе цёплых пасадаў. Вось і ты ў тэлеграме пішаш: «служба будзе» я ў гэтым не сумлеваюць але якая служба, каму? Служба працоўнаму народу ці каму іншаму? Служыць працоўнаму народу, служыць чэсна, сумленна — можна ня толькі ў Менску, а і тут заграніцай. І мне вельмі дзівіць, што ты гэтак упарта даводзіш без жадных доказаў, патрэбнасьць майго прыезду ў Менск, выстаўляючы адзін аргумент аб «службе». Значыцца: гэта твой аргумент адпадае, бо служыць свайму народу я магу і тут. Праўда я гэтага не скрываю, тут цяжка жыць, спрутнае ёсць маё матэр'яльнае становішча. Цярплю сухоўрыцу. Але ці вынікае з гэтага, што я павінен зрачыся ад свайго рэвалюцыйнага соцыялістычнага сьветапогляду. Безумоўна не? Я знаходжу для сябе лепшым памерці тут галоднай сьмерцю, але ратаваць сваю чалавечую годнасьць, чым быць у Менску самазадаволенай свіньнёй. Ты добра мяне ведаешь, і тым больш мяне дзівіць, што ты мне прапануешь гэткую ганьбу. Я толькі тады зраблю так, як ты радзіш — зьвярнуся за візай у радавае консульства ў Празе, калі ўлада дасьць магчымасьць легальна мне працаваць у БССР. Інакш кажучы, калі Урад БССР легалізуе Б.П.С.Р. Вот тады зусім іншая справа. А зьвяртацца цяпер, калі Урад праследуе рэвалюцыйна-сацыялістычную думку, калі ён зьдзяйсьняя ліквідацыю беларускіх соцыялістаў-рэвалюцыянераў, стварае атмасфэру ганебнага рэнегаства, рознымі ашуканствамі дэмаралізуе інтэлігенцыю, робіць злачынства над працоўным народам, цяпер я звярнуцца ў радавы кансулат за візай, каб паехаць у Менск на «службу» я не магу. Хутчэй я рашуся на іншы паступак — паеду на Ольшаны, каб там злажыць свае косьці дзе сьпіць вечным сном наш зямляк Дзяледнік. Гэткі ёсць мой пагляд. Мо гэта і неразумна, не практычна — але я інача не магу. Я ўважліва прыслухоўваюся да голасу маёй сьвядомасьці. Яна мне кажа — мая сьвядомасьць — будзь честным, крэпка дзяржыся праўды, адстаівай праўду. Кажы ўсім і кожнаму толькі праўду і за сваю праўду не страшыся і памерці.

Я рашыў лепш памерці, чым быць рэнегатам, сьмешнай рабачкай для ўцехі «нэпаўскай» пані. І калі настане такі час, што я не смогу далей працаваць на карысьць вызваленьня і адраджэньня прыгнечанага і паняволенага люду, тады я знайду спосаб, каб спыніць свае ўстаўшае нікому не патрэбнае жыцьцё. Зраблю гэта з дастойнасьцю належна беларускаму сацыялісту рэвалюцыянеру, а пакуль я яшчэ магу працаваць, пакуль яшчэ не адкажуцца служыць мне мае фізічныя сілы — я буду працаваць тут хоць чарнарабочым, ні на адну хвілю не пакідуючы сваёй навуковай і літэратурна-філязоўскай працы. Я пішу сур'ёзную працу. Мушу яе закончыць, колькі на гэта патрабуецца часу не ведаю. Мушу зарабляць на пражыцьце, гэта шмат часу адбірае. Але покуль яшчэ сілы працую.

Каб правідлова ты мяне зразумела ды пакінулася займацца роднымі дурніцамі, скажу табе яшчэ раз: для маёй навуковай і літаратурна-філязоўскай працы якую я цяпер пішу зарабляючы сябе на жыцьцё фізычнай працай чарнарабочай я мушу заставацца тут, у Эйропе. Магчыма паеду ў Францыю, а можа і ў Амерыку, каб там знайсьці падхадзячую працу, бо цяжка тут знайсьці працу, шмат беспрацоўных. Але не ў Менск, ні ў Вільню пры існуючых абставінах не паеду. Крывіць душой, падлыжнікам быць я не ўмею і не магу. Успомні Палуяна і яго трагічную сьмерць у Кіеве, чаму ён так пастуціў? Мой прыезд у Менск — хадзіць, прасіць, кланяцца розным паршыўцам каб далі візу, зракацца сябе, о лепей уж тады пайці шляхам Палуяна! Так і знай, гэта мае апошняе слова. Я бо прыеду ў Менск як вольны грамадзянін, або застануся на чужыне на ўсё жыцьцё свае эмігрантам. Можа быць хто небудзь, калі небудзь найдзе мае каштоўныя рукапісі, прачытае, знойдзе магчымасьць іх выдаць. Працую для будучых пакаленьняў, больш сьвядомых і чэсных, шчасьлівейшых за мяне. Бывай здарова. ТАМАШ».

Дата не пазначаная, але можна меркаваць, што гэта май ці чэрвень дваццаць шостага, і што Купала, прачытаўшы гэты ліст (вядома, з рук Мядзёлкі), напісаў свой верш «І прыйдзе»,— пад уражаннем...

«І прыйдзе новых пакаленняў...» Параўнайце: «Можа быць хто небудзь, калі небудзь», «Працую для будучых пакаленьняў»...

«У сведкі запісы пакліча...» Параўнайце: «...найдзе мае каштоўныя рукапісі, прачытае, знойдзе магчымасьць іх выдаць»...

Верш наскрозь працяты болем Грыба. Разам з тым, у ім — Купалаў боль, Купалаў сорам і Купалава трывога.

«І засумуецца патомак, калі даэнаецца аб нас...»

Калеснік піша: «Паміж гэтымі двума этапамі стаяла самая страшная Паўлініна Галгофа — савецкая, калі Мядзёлцы даводзілася даказваць нашпігаваным падазронасцю і нянавісцю следчым, што яна ад пачатку 20-х гадоў не мела ніякай сувязі з Тамашом Грыбам, на якім савецкая ідэалогія паставіла таўро ворага, які мог быць і змоўнікам ды прапанаваць ёй супрацоўніцтва».

Ды не магла яна не ведаць, любая Калесніку ды Марціновічу «Паўлінка-журавінка», што адпраўленыя ёю тэлеграма і пісьмо з СССР у Прагу ГПУ абавязкова прачытала і занесла ў яе справу. І адказ ёй з Прагі там таксама ёсць. І хто ёй прапаноўваў «супрацоўніцтва» — Тамаш ці ГПУ — яна таксама ведала (не разумею, чаму Калеснік абрэвіятуру ГПУ перарабляе скрозь на ДПУ).

Не следчых спрабавала падмануць Мядзёлка,— ёй бы гэта не ўдалося. Пішучы свае ўспаміны, яна скрозь імкнецца падмануць Гісторыю. Калеснік, Марціновіч, Вераціла — ёй паверылі.

Калеснік піша пра Мядзёлку: «Птушка ў клетцы». А Гісторыя на клетку пачапіла шыльдачку: «Што це за птиця», як казалі некалі героі аднайменнай украінска-беларускай інтэрмеды.

Георгій КОЛАС.

Хутка ў вырай



ДОМ ЛІТАРАТАРА ЗАПРАШАЕ!

7 кастрычніка. «І за гарою пакланюся...» Вечарына, прысвечаная 75-м угодкам Фёдара Янкоўскага.

14 кастрычніка. Сцежкамі Язэпа Драздовіча. Да 105-годдзя мастака.

19 кастрычніка. Кніжнік Ярыла. Да 110-годдзя Вацлава Ластоўскага.

21 кастрычніка. Прэм'ера кнігі Паўла Прудніката «За калючым дротам».

26 кастрычніка. Вясковы лірнік. Да 170-годдзя Уладзіслава Сыракомлі.

29 кастрычніка. Паэтычная пятніца. Вечарына Валянціны Аксак.

Пачатак усіх вечарын а 18.30.

Калі за адраджэнне мовы, чытай, спадарства «НАША СЛОВА»!

З 1 верасня пачалася падпіска на беларускую перыёдыку на 1 квартал 1994 года. Падпісная цана на наш штотыднёвік (з улікам паслуг сувязі) на 1 месяц — 60 рублёў; на 3 месяцы — 180 рублёў; Індэкс 63865.

Заставайцеся з намі — не пашкадуеце. «Наша слова»— гэта Ваша газета, і яе не замяніць ні адно іншае выданне. Выпісвайце і чытайце «Наша слова»!

Гісторыя ў анекдотах

КАЗЛОЎ Р. Л.

Рыцары Еўрапейскай Сарматыі

У часы татарскіх наездаў, што прыносілі нашым продкам нямала гора, трэба было вельмі і вельмі паклапаціцца, каб і самому не трапіць у палон ці, не дай Божа, загінуць і сваіх блізкіх забяспечыць. Калі такая навала раптам звалілася на галовы жыхароў аднаго з паўднёвых паветаў, мясцовыя шляхціцы сталі раіцца, як і дзе найлепш уладкаваць свае сем'і. Вырашылі, што найбольш адпаведным месцам будзе мужчынскі кляштар, што знаходзіўся непадалёк. І калі па гэтым пытанні ўсе прыйшлі да згоды, устаў адзін шляхціц, жонка якога сваёй прыгажосцю была вядома на ўсю акругу, пачухаў патыліцу і сказаў: «А ліха яго ведае, ад каго большая небяспека будзе — ад татараў, а мо ад манахаў...»

У часы Жыгімонта Старога і каралевы Боны прыезды іншаземцаў, асабліва італьянцаў, сталі амаль звычайнай справай. Нярэдка такіх гасцей запрашалі да сябе тыя з шляхціцаў, што маглі накрыць добры стол. Пра гасціннасць і вялікі спрыт у спажыванні адмысловых і высокакаларыйных страў трэба яшчэ абавязкова сказаць далей. Бо вядома — гэта ж адна з генетычных рыс славянскіх сарматаў, якая, дзякуй Богу, то тлее, то разгараецца нават і ў нашы часы. Але аб усім па парадку.

На двор да аднаго заможнага шляхціца чынна і з цікавасцю на твары ўязджае запрошаны госць з далёкай Балоньі. Гаспадар з шчырым гонарам паказвае сваю радавую сядзібу, галоўны аб'ект якой — драўляны палац у мясцовым стылі.

— О, які цуд! — аддаючы даніну моманту, усклікае чужаземец, чым бясконца ўлагоджвае пачуцці зямяніна, і завяршае: — Я ніколі ў жыцці не бачыў так прыгожа складзеных дроў!

Як кожнаму падабаецца свой асабісты розум, так падабаецца і свая нацыянальная ежа. Вядома, адкуль да нас прыйшлі розныя прыправы ды салаты — усё з той жа Італіі. І, відаць, толькі пякучае жаданне неяк прыпадобніцца да цывілізаванай Еўропы, якую тады не без падстаў рэпрэзентавала Італія, прызвычаіла мясцовых гурманаў да разнастайнай гародніны.

Нейкі шляхціц адправіў свайго сына вучыцца ў Падую, што ў Італіі. І як жа ён здзівіўся, калі праз некалькі месяцаў сын раптам з'явіўся на родным двары. Бацьку студэнт растлумачыў: «Усё лета мяне кармілі нейкай травою, дык я зрабіў выснову, што ўзімку пачнуць карміць сенам, чаго мне не вынесці, і вырашыў уцячы».

Так цяжка адвыкнуць ад аднойчы дэгуставаных натуральных страў з лепшых фрагментаў хатняе ці дзікае жывёлы. Паверце, гатаваць нашы продкі маглі на дастатковым узроўні і надавалі гэтаму працэсу не менш (а можа, і больш) увагі, чым зараз. Пра гэта сведчаць многія летапісы і хронікі, некалькі пазней з'явіліся кулінарныя кнігі. Вядома, якой пашанай карысталіся на вялікакняжацкім і каралеўскім дварах добрыя кухары. Ды і на шляхецкай кухні талентаў было нямала. Любая гаворка нязменна, рана ці позна, а такі збочвала на застольныя атрыбуты і падзеі вакол іх. Нездарма адзначалася: «Найлепшыя весці — калі нясуць есці».

Сармацкае рыцарства ставілася да харчавання, як да ваеннай справы. На некалькі стагоддзяў укараніўся звычай наязджаць нечакана ў госці да якога-небудзь гаспадара і жыць у яго да той пары, пакуль усё не будзе з'едзена і выпіта. Вельмі падобна на нашэсце нейкага ворага, з той толькі розніцай, што пачастункі выстаўляліся на стол не пад пагрозай зброі, а па прынцыпу: «госць — кароль» ці «госць у дом — Бог у дом». Лепш разарыцца, чым паказаць сваю негасціннасць. Хутчэй за ўсё падобныя прынцыпы былі прыдуманыя гасцямі.

Апавядалі, як аднаго разу да шляхціца сярэдняй рукі завітаў суседні зямянін з усімі сваімі замачадцамі. Гасцяванне зацягнулася, аж пакуль не стала чаго і на стол падаць, бо каморы і свіронкі апусцелі. Толькі тады за сціплай вячэрай старэйшы з «дарагіх» гасцей заявіў, каб іх рана пабудзілі, бо пара і дамоў. Узрадаваны гаспадар не змыкаў вачэй усю ноч, абы толькі не праспаць такі шчаслівы момант развітання. І толькі праблісюнуў золак, як ён хутка ўсхапіўся.

Пародыі

Г. ЮРЧАНКА

Пра німб і іншае

Паэт павінен быць зямным,
Хоць божы німб над ім,
як зязянне...
. . . .
Плачу за яе любоў.
(Не дзейка — не йдзе задарам.)
Леанід Галубовіч

Паэта лёс — не час гульбы.
Спрачайся век з самім сабою.
Заўжды ўставай для барацьбы
І спаць кладзіся з барацьбою.

Таму і мне не першы раз
Гарэць у ярасным змаганні,
Шукаць у зорнасці адказ
На спаконвечныя пытанні;

У глыбах дзён не йскаць цаны
Бурліва ўспененаму друзу.
А Муза?
Выкінь чацвяртны —
Штоноч на ложку будзе Муза.

Знясуць вятры эпохі дым!
З надзеяй у любой нагодзе
Паэт павінен быць зямным,
Хоць німб святы яму б не
шкодзіў...

Прага палёту

Для шулаў, для лагаў — дубы,
Глухім плывучы абшарам,
Раструшчвалі чарапы
Аблезлым балотным хмарам.
Леанід Дранько-Майсюк

Для шулаў, штандараў дубы
З шырокіх палескіх абшараў
Ірваліся ўстаць на дыбы,
Каб кінуцца воўкам на хмары.

Ляталі сякеры, крукі,
І кроквы, і дранка, і дошкі,
І ў лёце імклівым цвікі
Кашам не ўступалі ні трошкі.

Аполкі нясліся наўскач.
Стамескі шмыгалі праворна.
Кружыў над Палессем таўкач,
Штоміг абганяючы жорны.

Зрываліся з коляя вярчы.
Ляцелі і клёпкі, і донцы.
І з шаек кругі-абручы
Цалялі падняцца да сонца.

Пад воблакі рынуўся плот,
Віліся бязмен і нажніцы...
Так цягне самога ў палёт,
Што сіл не хапае спыніцца.

АФАРЫЗМЫ

У. БУЛАТАВІЧ ВІБ

— На якой ніве працуеш цяпер? — пытаецца пудзіла ў другога.
— На культурнай.

* * *

Кажа коршун кураняці:
— Чаго ты скардзішся на мяне? Я ж памагаю табе ўзняцца высока.

* * *

Гэта, мабыць, прыемна — мець аднадумцаў нават тады, калі і не думаеш.

Пераклаў з сербскахарвацкай Іван ЧАРОТА.

ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ ПА ТЭЛЕВІЗАРЫ?

6 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА
17.05. Скарбы беларускай гісторыі.
17.50. «Пяць зорак». Тэлегульня.
21.00. Панарама.
23.35. НІКа.

7 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР
9.40. «Вобраз». Літаратурны тэлечасопіс.
12.30. «Пяць зорак». Тэлегульня.
13.30. Навіны.
16.55. Беларуская літаратура. XI клас.
18.20. Навіны Бі-бі-сі.
21.00. Панарама.
22.30. Студыя «Сэнс» у Валожынскім раёне.
24.00. НІКа.

8 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА
13.30. Навіны.
16.45. Голас. Літаратурна-мастацкі відэаканал для школьнікаў.
18.30. Навіны Бі-бі-сі.
19.10. Пазіцыя ўрада.
21.00. Панарама.
23.15. НІКа.

9 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА
14.00. «Скарб-93». Фестываль талентаў.
15.30. «Роднае слова». Тэлечасопіс.
16.00. Аўтарскі вечар кампазітара Ігара Лучанка.
21.00. Панарама.

10 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ
13.20. Кінаэкран-93.Кастрычнік.
14.15. На крылах кажана.
20.00. Панарама.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф. Скарыны.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13. Тэлефон: 33-17-83

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адпавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.

Індэкс 63865. Зак. 291.

МВПА імя Якуба Коласа, Менская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка», 220079, г. Менск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Індэкс 63865.

Наклад 7245 паасобнікаў. Падпісана ў друк 4.10. 1993 г. у 15 гадзін.